

Сувеніры з рыбы ад маёра міліцыі

СТАР. 3



«Каралева» сярод старажытных картаў

СТАР. 6



Падарункі любімым артыстам ад прыхільнікаў

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 ЛІПЕНЯ 2014 г. АЎТОРАК № 140 (27750) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## У ФАРМАЦЕ ДЫЯЛОГУ

### Мы гатовы выбудоўваць адносіны з ЕС і ЗША, але не на шкоду нацыянальным інтарэсам

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ў час рабочай сустрэчы з міністрам замежных спраў Уладзімірам Макеем, паведамляе прэс-служба беларускага лідара.**

«Апошнім часам мы канстатуем факт, што Еўрапейскі саюз, ды і ЗША, можа, праз зубы, але неяк пачынаюць размаўляць з Беларуссю. Хачу публічна падкрэсліць, што ў нашы планы ні ў якім выпадку не ўваходзіць нейкае стварэнне дадатковай напружанасці з Еўрапейскім саюзам, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — У нас і так хапае гэтай напружанасці, нам трэба разрульваць гэту сітуацыю, але не на шкоду нашай краіне».

Прэзідэнт адзначыў, што гэтыя пытанні абмяркоўваліся ў час яго нядаўняй сустрэчы з кіраўнікамі беларускіх дыпрадстаўніцтваў. Ён таксама пацікавіўся вынікамі вучобы кіраўнікоў беларускіх загранустаноў, якая штогод праводзіцца ў Міністэрстве замежных спраў.

У ходзе рабочай сустрэчы Прэзідэнта і міністра замежных спраў была таксама закранута беларуска-расійская тэматыка. «Наш лёс такі, што мы паміж Захадам і Усходам, і зыходзячы з гэтага мы выбудоўваем нашы адносіны і нашу пазіцыю, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Але гэта не значыць, што мы спрабуем сядзець на двух крэслах. Гэта непрымальна для нас, гэта не аснова нашай знешнепалітычнай і эканамічнай дактрыны».

На рабочай сустрэчы былі закрануты і пытанні, звязаныя з сітуацыяй ва Украіне, выкананне раней дадзеных Прэзідэнтам Беларусі даручэнняў па эканамічным супрацоўніцтве з гэтай краінай.

Кіраўнік дзяржавы таксама пацікавіўся ў міністра тэндэнцыямі знешнеэканамічнай дзейнасці — ці ёсць зрухі, асабліва ў рэалізацыі прадукцыі за межы краіны.

Прэзідэнт у цэлым падтрымаў планы знешнепалітычнага ведамства па пашырэнні інтарэсаў Беларусі ў розных сферах.

## НАЙВЫШЭЙШЫ ПІЛАТАЖ

### У НАШАЙ КРАІНЕ З'ЯВІЦЦА АВІЯЦЫЙНАЯ АКАДЭМІЯ

**У ходзе рабочай сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з міністрам транспарту і камунікацый Анатолем Сіваком і першым намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандрам Радзьковым абмяркоўвалася прапанова аб пераўтварэнні Мінскага дзяржаўнага вышэйшага авіяцыйнага каледжа ў акадэмію, паведамляе БЕЛТА.**

Прэзідэнт растлумачыў вынясенне гэтага пытання на публічнае абмеркаванне выключнай важнасцю захавання адукацыйнай базы для падрыхтоўкі авіяцыйных спецыялістаў, каб не дапусціць узнікнення праблем, з якімі, напрыклад, сутыкнулася Расія, дзе недастатковы прафесійны ўзровень лётнага складу прывёў да шэрагу аварый і катастроф. Пры гэтым Прэзідэнт асабліва падкрэсліў, што размова павінна весціся не аб фармальным змяненні назвы або статусу, а аб глыбіннай рэформе.

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся ва ўдзельнікаў сустрэчы неабходнасцю прапанаванага пераўтварэння, звязанымі з гэтым матэрыяльнымі затратамі. Адным з пунктаў абмеркавання таксама стала пытанне аб неабходнасці перадачы гэтай установы з ведання Мінтранса Міністэрству адукацыі. Прэзідэнт падкрэсліў, што ў любым выпадку галоўная задача заключаецца ў знаходжанні лепшага варыянта з пункту гледжання эфектыўнасці прапанаваных пераўтварэнняў.

Анатоль Сівак далажыў, што з фармальнага пункту гледжання неабходнасць змянення статусу выклікана тым, што Кодэкс аб адукацыі не прадугледжвае наяўнасці такога віду навучальных устаноў, як вышэйшы каледж. Але, безумоўна, маецца на ўвазе таксама глыбокая рэформа з пункту гледжання якасці адукацыі. «Каледж рыхтуе спецыялістаў вышэйшай і сярэднетэхнічнай адукацыі, але сёння трэба зрабіць крок наперад», — адзначыў міністр.

Па выніках рабочай сустрэчы Анатоль Сівак расказаў журналістам, што каледж і ствараемую на яго базе авіяцыйную акадэмію вырашана пакінуць у веданні галіновага міністэрства. Паводле яго слоў, размова ішла не толькі аб каледжы і падрыхтоўцы кадраў для авіяцыйнай галіны, але і аб падрыхтоўцы спецыялістаў для ўсёй транспартнай галіны краіны.

Прапануецца, што акадэмія будзе створана на працягу года. Пры гэтым плануецца мадэрнізацыя матэрыяльна-тэхнічнай базы, павысяцца патрабаванні да выкладчыцкага складу.



## ДЗВЕ ГРАЦЫІ

Фота БЕЛТА.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў:**

***«Наша краіна вядзе перамовы аб спрашчэнні візавага рэжыму і адмене віз прыкладна з паўтара дзясяткамі дзяржаў — гэта і Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, і Сінгапур, і шэраг іншых. Задача заключаецца ў тым, каб выканаць установку Прэзідэнта, якую ён даў у Пасланні парламенту і народу ў 2013 годзе. Мы павінны стварыць нармальныя ўмовы для вядзення бізнесу ў нашай краіне з тымі дзяржавамі, якія нам цікавыя. Што тычыцца нашых адносін з Еўрапейскім саюзам, то ўжо адбыўся першы раўнд кансультацый па заключэнні пагадненняў аб аблягчэнні візавага рэжыму і рэадмісіі з ЕС. Мы выпрацавалі канкрэтную аснову для далейшай працы. Думаю, што будзем спакойна рухацца ў гэтым кірунку, зыходзячы з таго, што гэтыя пагадненні выгадныя для грамадзян нашых дзяржаў, але яны павінны быць пабудаваны на раўнапраўнай, недыскрымінацыйнай аснове».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.07.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10300,00 | ■ |
| Еўра | 13830,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 291,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 860,86 | ▼ |

■ Віды на ўраджай

## БУДЗЕМ З ХЛЕБАМ!

### НА МАГІЛЁЎШЧЫНЕ СПРАЎЛЯЛІ ЗАЖЫНКІ І ВІНШАВАЛІ ПЕРШЫХ У КРАІНЕ «ТЫСЯЧНІКАЎ» ПА РАПСЕ



**Тысячнікі агракамбіната «Зара» — кіроўца Хасія Лангуры і камбайнеры бацька і сын Уладзіміры Корсакі.**

**Рэкордных вынікаў дабіўся знакаміты па мінулых уборачных сямейны экіпаж камбайнераў агракамбіната «Зара» — бацька і сын Уладзіміры Корсакі. Яны намалацілі першыя 1076 тон рапсу. Але перад тым, як наведацца ў гэтую гаспадарку, губернатар вобласці Пётр Руднік разам з прадстаўнікамі мясцовай улады і кіраўніцтвам прафсаюза АПК завітаў у Шклоўскі раён, каб прыняць удзел у зажынках і павіншаваць яшчэ адных перадавікоў жніва — з ААТ «Александрыйскае». Ударнікі атрымалі падарункі, а іх тэхніку ўпрыгожылі сцяжкі і зорачкі лідараў, каб іншыя бачылі, на каго раўняцца.**

### КОЖНАЯ ХВІЛІНА НА ЎЛІКУ

У былыя часы лічылася: як правядзеш зажынкі, такі збярэш і ўраджай. Свята не абыходзілася без песняў і народных гульняў, а вось жніво пачыналася на наступны дзень. На Магілёўшчыне зрабілі адступленне ад сцэнарыя. Цяпер кожная хвіліна на ўліку, і зажынкі ў Шклоўскім раёне адзначалі проста ў полі. Дзякуй **начальніку аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Шклоўскага райвыканкама Сяргею АРТАМОНАВУ,** які дапамог карэспандэнту «Звязды» дабрацца да месца. Ад паху духмяных караваяў, якія ляжалі на заднім сядзенні яго машыны, кружылася галава. Па традыцыі іх пякуць яшчэ з леташняга ўраджаю, каб новы быў не горшым.

Яшчэ на пад'ездзе да вёскі Калінаўка было відаць, як кіпіць праца на калгасных палетках. Падтрымаць баявы дух салдат жніва прыехалі артысты шклоўскага ансамбля народнай песні і танца «Бліскавіца». Гукарэжысёр, які настройваў апаратуру ў палявых умовах, імкнуўся перакрычаць тарахценне камбайнаў.

СТАР. 2

■ Надвор'е

## ПЛЮС 35

### Бліжэйшыя выхадныя будуць надзвычай спякотнымі

«Згодна з кліматычным аналізам летняга сезона, «макушка лета» ў Беларусі звычайна прыпадае на канец ліпеня — пачатак жніўня. Усе экстрэмальныя значэнні лета назіраліся менавіта ў гэты перыяд», — паведаміла БЕЛТА **галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Людміла ПАРАШЧУК.** Самы гарачы ліпеньскі дзень быў зарэгістраваны 30 чысла 1936 года ў Гомелі, калі тэмпература паветра дасягнула плюс 37,9 градуса, самы гарачы дзень жніўня з тэмпературай у разгар дня 38,9 градуса быў адзначаны ў гэтым жа горадзе 8-га чысла 2010 года.

Як і чакалася, самыя гарачыя дні прыпалі менавіта на другую палову ліпеня — першыя чыслы жніўня. «Галоўнай прычынай такой сінаптычнай сітуацыі стаў шырокі цёплы скандынаўскі антыцыклон, які, перамясціўшыся на тэрыторыю Паволжа, пакінуў Беларусь на сваёй заходняй частцы. І цяпер разам з паўднёвымі патокамі ў рэспубліку паступае трапічнае паветра», — расказала Людміла Парашчук. Ва ўмовах невялікай воблачнасці і ўсё яшчэ вялікай працяглы светлавога дня паветра добра праграваецца.

Да канца ліпеня ў многіх раёнах Беларусі дзённая тэмпература паветра чакаецца ў межах плюс 30–35 градусаў. Не так горача будзе толькі ноччу. Жнівень стартуе таксама гарачым надвор'ем. У пятніцу тэмпература паветра ноччу складзе плюс 16–22 градусы, днём паветра прагрэецца ад 30 да 35 градусаў, па паўночным захадзе, дзе чакаецца больш воблачнасці, прагназуецца 27–29 градусаў са знакам плюс. Месцамі па паўночным захадзе рэспублікі пройдуць кароткачасовыя дажджы, прагрымяць навальніцы.

У выхадныя тэмпература паветра ноччу складзе плюс 16–22 градусы, у дзённыя гадзіны паветра прагрэецца да 30–35 градусаў цяпла. У асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы.

У сувязі з гарачым і ў асноўным сухім надвор'ем у лясах Беларусі рэзка павялічваецца пажаранебяспечнасць.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У ААН НАЗВАЛІ КОЛЬКАСЦЬ ЗАГІНУЛЫХ НА ЎСХОДЗЕ УКРАІНЫ

З пачатку сілавой аперацыі на ўсходзе Украіны загінулі сама меней 1129 мірных жыхароў, параненыя амаль 3,5 тысячы, больш за 100 тысяч чалавек сталі вымушанымі перасяленцамі. Пра гэта гаворыцца ў прэс-рэлізе інфармацыйнага цэнтра ААН аб чарговым дакладзе маніторынгавай місіі Упраўлення Вярхоўнага камісара Аб'яднаных Нацый па правах чалавека. Вярхоўны камісар ААН па правах чалавека Наві Пілэй адзначыла, што па інфармацыі, якая паступае, у Данецкай і Луганскай абласцях і сілавікі, і апалчэнцы выкарыстоўваюць цяжкае ўзбраенне ў населеных раёнах. «Усё нарастаючая колькасць ахвяр і разбурэнне грамадзянскай інфраструктуры могуць, у залежнасці ад абставін, лічыцца парушэннем міжнароднага гуманітарнага права», — сказала Пілэй.

### ПРАКУРАТУРА ГРУЗІІ ЗАВЯЛА СПРАВУ НА СААКАШВІЛІ



Галоўная пракуратура Грузіі мае намер прыцягнуць да крымінальнай адказнасці былога прэзідэнта Грузіі Міхаіла Саакашвілі. «Справа тычыцца разгону мітынгоўцаў 7 лістапада 2007 года, разгрому тэлекампаніі «Імеды» і завалодання маёмасцю, якая належыць Аркадзю (Бадры) Патаркацышвілі», — цытуюць СМІ заяву нагляднага ведамства. Расследаванне вядзецца па частцы 3 артыкула 333 КК Грузіі — «Перавышэнне службовых паўнамоцтваў з прыніжэннем асабістай годнасці пацярпелага», якая прадугледжвае максімальнае пакаранне да васьмі гадоў турмы. Раніцай 28 ліпеня Саакашвілі выклікалі на допыт у Галоўную пракуратуру краіны, але ён туды не з'явіўся, распаўсюдзіўшы заяву, у якой абвінаваціў цяперашнія ўлады Грузіі ў палітычным пераследзе апанентаў, і адзначыў, што не збіраецца «ўдзельнічаць у гэтым фарсе». Саакашвілі з'ехаў з Грузіі ў лістападзе 2013 года і з таго часу ні разу не прыязджаў на радзіму.

### СМЕТАНКОВАЕ МАРОЗІВА БОЛЬШ КАРЫСНАЕ, ЧЫМ САРБЕТ



Марозіва не так шкодзіць фігуры, як мяркуецца. Выбіраць сарбет (аналаг фруктовага лёду) замест ванільнага марозіва, каб не набраць калорыіі, бессэнсоўна, перадае My Daily. 100 грамаў ванільнага марозіва змяшчаюць 17 грамаў тлушчаў, 14 грамаў цукру, а энергетычная каштоўнасць такога ласунку складае 251 калорыю. Выбіраючы больш «дыетычны» сарбет, мы атрымліваем 77 калорый, 0,5 грама тлушчу, але 13,5 грама цукру. У класічнага ванільнага марозіва глікемічны індэкс складае 68, у яго абястлушчанай версіі — 114, а ў сарбету — 85.

ISSN 1990 - 763X

14140

9 771990 763008

#### ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ГЕРМАНІЯ ПАЧНЕ ШПІЁНІЦЬ ЗА ЗША І ВЯЛІКАБРЫТАНІЯЙ

Урад Германіі мае намер пачаць сачэнне за працай агентаў ЗША і Вялікабрытаніі, паведамляе Deutsche Welle. Рашэнне Берліна было прынята на фоне нядаўняга скандалу вакол дзейнасці амерыканскіх спецслужбаў у ФРГ. Як піша брытанская газета The Independent, адпаведнае распараджэнне дала канцлер ФРГ Ангела Меркель. Паводле інфармацыі выдання, акрамя сачэння за меркаванымі агентамі, назіранне плануецца весці за электроннай перапіскай і тэлефоннымі размовамі замежных пасольстваў. У інтэрв'ю нямецкай газеце Frankfurter Allgemeine Zeitung кіраўнік Федэральнага ведамства па ахове канстытуцыі Ханс-Георг Маас заявіў, што Берлін таксама мае намер узмацніць супрацьдзеянне сачэнню з боку краін-саюзнікаў. «Ёсць старая прыказка: «Давярай, але правярай». І менавіта таму мы будзем умацоўваць нашу абарону», — заявіў Маас. Ён таксама адзначыў, што ўрад Германіі не можа і далей мірыцца са шпіянажам з боку ЗША, «чаша цярпення перапоўнена».

#### КОРАТКА

У чэрвені беларусы набылі наяўнай замежнай валюты на $753,3 млн, прадалі на $809,4 млн у эквіваленце. Для параўнання: у чэрвені 2013 года адпаведна $771,7 млн і $593,1 млн у эквіваленце.

**Ва ўсіх манастырах і храмах Беларускай праваслаўнай царквы 1 жніўня 2014 года пройдуць памінальныя богаслужэнні з памінаннем ахвяр Першай сусветнай вайны, паведамілі ў Беларускім экзархаце.**

Першы рухомы састаў новага тыпу з'явіцца ў сталічнай падземцы ў пачатку 2016 года.

**Паслугі тэлефоннай сувязі падаражэюць у Беларусі з 1 жніўня прыкладна на 20%. Таксама з 1 жніўня міжгароднія званкі будуць каштаваць на 12,1% больш — Br81,4 за мінуту.**

Паводле апошніх даных, пытанне аб прымяненні закона аб амністыі з нагоды 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў разгледжана ўжо ў адносінах да больш як 2,9 тыс. асуджаных, якія знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі.

■ Бяспека руху

## НЕ «КАТАЦЦА» — ЕХАЦЬ

### Сёлета сем веласіпедыстаў загінулі і амаль семдзесят пакалечыліся

**Часам здаецца, што веласіпед з'яўляецца не транспартным сродкам, а інструментам для павышэння адрэналіну. У выніку палётаў па асфальце ўладальнікі веласіпедаў нярэдка па сваёй бестурботнасці становяцца ахвярамі аварый. Тым часам статыстыка ўжо сведчыць пра павелічэнне дарожных здарэнняў з непасрэдным удзелам веласіпедыстаў. Пра гэта ў інтэрв'ю «Звяздзе» паведаміла Ганна БАНАДЫК, старшы інспектар па асаблівых даручэннях упраўлення ДАІ Міністэрства ўнутраных спраў.**



Фота БЕЛТА.

— Веларух у Беларусі становіцца ўсё больш папулярным, модным, — кажа спадарыня Ганна. — Яшчэ колькі гадоў таму на веласіпедах актыўна перамяшаліся лічаныя дзясяткі, а цяпер на іх пастаянна ездзяць тысячы беларусаў. Аднак нельга сказаць, што хаця б палова з іх азнаёмілася з правіламі дарожнага руху.

СТАР. 3

# У «БЕЛНАФТАХІМА» НОВЫ КІРАЎНІК

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў згоду на назначэнне старшынёй Беларускага дзяржаўнага канцэрна па нафце і хіміі Ігара Ляшэнкі, які да гэтага часу займаў пасаду першага намесніка старшыні «Белнафтахіма», паведамляе БЕЛТА.**

Адпаведнае рашэнне кіраўнік дзяржавы прыняў учора па выніках рабочай сустрэчы з Ігарам Ляшэнкам, дзе таксама прысутнічаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй Кабякоў. Прэзідэнта перш за ўсё цікавіла эфектыўнасць работы падведамных прадпрыемстваў «Белнафтахіма», пытанні кадравага патэнцыялу, асабліва ў прымяненні да кіраўніцтва гэтых прадпрыемстваў. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы нагадаў, што прадукцыя, якая выпускаецца аганізацыямі канцэрна, фарміруе значную частку ВУП Беларусі. Андрэй Кабякоў далажыў, што «Белнафтахім» у асноўным спраўляецца з заданнямі па выкананні асноўных эканамічных паказчыкаў. Паводле яго слоў, рэнтабельнасць канцэрна складае 13,5 працэнта пры заданні на ўвесь 2014 год 9,8 працэнта. Суадносіны запасаў гатовай прадукцыі і сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці складаюць крыху больш як 21 працэнт пры заданні 24 працэнты. У той жа час канцэрн пакуль крыху недабірае па экспарце выробленай прадукцыі, які ў першым паўгоддзі складае 99 працэнтаў да аналагічнага перыяду мінулага года пры заданні 102,6 працэнта.

Учора ж Андрэй Кабякоў прадставіў калектыву «Белнафтахіма» новага кіраўніка.

■ Рыхтуемся да школы

# ЗБЯРЭМ ПАРТФЕЛЬ РАЗАМ

**Усе тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Міншчыны ў ліпені-жніўні праводзяць дабрачынныя акцыі і марафоны па зборы канцылярскіх прылад, адзення, абутку і грашовых сродкаў. Мэта акцыі — дапамагчы сем'ям годна падрыхтаваць дзяцей-школьнікаў да новага навучальнага года.**

Напрыклад, ва Уздзенскім раёне стартаваў марафон для выхаванцаў сем'яў, што апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, і дзяцей, якія знаходзяцца ў аддзяленні сацыяльнага прытулку раённага сацыяльна-педагагічнага цэнтра.

У Дзяржынскім раёне сумесна з раённай арганізацыяй «Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа» зладжана акцыя «1+1». Дапамогу ў падрыхтоўцы да школы атрымаюць дзеці са шматдзетных сем'яў, дзеці-сіраты і дзеці, што засталіся без апекі бацькоў або апынуліся ў сацыяльна небяспечным становішчы. Акцыя «Мы дапамагаем дзецям» — для шматдзетных сем'яў, дзе выхоўваецца 7 і больш непаўналетніх.

У Вілейскім раёне арганізавана акцыя «Хутка ў школу». Неабыякавыя людзі акажуць падтрымку малазабяспечаным сем'ям і сем'ям, што сутыкнуліся з цяжкімі жыццёвымі абставінамі. У тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання арганізаваны пункт прыёму неабходных школьнікам тавараў і прылад. У цэнтральнай раённай бальніцы 20 жніўня адбудзецца святочнае мерапрыемства для дзяцей-пацыентаў, а ў Палацы культуры 26 жніўня — конкурсная забаўляльная праграма для гадаванцаў з сацыяльна неўладкаваных сем'яў. З 25 па 30 жніўня пройдзе экспрэс-марафон «Падзяліся цеплынёй сэрцаў». Падчас яго будзе арганізаваны збор неабходных рэчаў для выхаванцаў сацыяльнага прытулку раённага сацыяльна-педагагічнага цэнтра.

У Клецкім раёне марафон «Добры дзень, школа!» ладзіцца разам з прадпрыемствамі горада і раёна, сельгасарганізацыямі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі.

На Салігоршчыне — дабрачынная акцыя «Збярэм партфель разам 2014». Да яе падключыліся таксама раённая арганізацыя Беларускага саюза журналістаў, грамадская арганізацыя «Беларускі дзіцячы фонд». З 1 ліпеня ў будынку тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва адкрыты пункт прыёму школьнай формы, дзіцячага абутку, спартыўнага адзення, канцылярскіх тавараў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

■




■ На свае вочы

# ВЯЛІКАЯ КАРЫСЦЬ АД МАЛОЙ ЭНЕРГЕТЫКІ

**Карэспандэнт «Звязды» пабываў на месцы будаўніцтва самай магутнай у нашай краіне гідраэлектрастанцыі. Гэтую ГЭС будуюць кітайскія спецыялісты. Цікава, што менавіта яна — першы ў Беларусі аб'ект Кітайскай нацыянальнай карпарацыі па электраабсталяванні. Карпарацыя мае вопыт працы больш як у 50 краінах свету. Крэдытнае фінансаванне аказвае Дзяржаўны банк развіцця Кітая. Кантрактная цана будаўніцтва пад «ключ» — каля 190 мільёнаў долараў. Яна ўключае ў сябе, акрамя праектавання і будаўніцтва, тэхнічнае абслугоўванне ў гарантыйны перыяд і навучанне персаналу.**


Фота Аляксея СПАТКАЯ.

На рацэ Заходняя Дзвіна ГЭС пачне выпрацоўваць электраэнергію ў 2017 годзе. Электраэнергіі з лішкам хопіць, каб забяспечыць патрэбы Віцебскага раёна.

Аб'ёмы зробленага ўражваюць. У прыватнасці, з катлавана ГЭС «выцягнулі» 70 тысяч кубаметраў грунту. Былі пабудаваны інтэрнат, дзе жывуць кітайскія рабочыя, сталовая, офіс, міні-бетонны завод, арматурны цэх… Кітайскім калегам дапамагаюць беларускія дарожнікі, будаўнікі. Беларусы часткова займаліся і праектаваннем.

— Гідраэнергетыка — шлях, які выбралі ўсе цывілізаваныя краіны свету. Сёння пачынаюцца асноўныя работы па ўзвядзенні самай буйной у краіне гідраэлектрастанцыі магутнасцю 40 мегават. Яе запуск дазволіць штогод эканоміць 38,6 тысячы тон умоўнага паліва. Па сённяшніх цэнах эканомія валюты — 7 мільёнаў долараў ЗША. Пры гэтым станцыя будзе выпрацоўваць 138 мільёнаў кілават-гадзін электраэнергіі ў год,— сказаў **міністр энергетыкі Рэспублікі Беларусь Уладзімір ПАТУПЧЫК.**

Паводле слоў міністра, дзякуючы Віцебскай ГЭС з'явіцца 30 працоўных месцаў і будзе створана зона адпачынку на вадасховішчы.

— Вельмі прыемна працаваць у вашай рэспубліцы. Тут добры клімат, а беларускі народ дружалюбны. Ва Усходняй Еўропе мы будуем мала аб'ектаў. Лічу, што Віцебская ГЭС стане вельмі добрай «прэзентацыяй» нашых сумесных магчымасцяў і патэнцыялу,— сказаў **прэзідэнт Кітайскай нацыянальнай інжынернай кампаніі па электраэнергіі Цзынь ЧУНЬШЭН.**

Чуткі пра тое, што ў сувязі з будаўніцтвам ГЭС частка ракі перастане быць суднаходнай, не пацвердзіліся. Праекціроўшчыкі, вядома, улічылі, што ГЭС знаходзіцца на славутым шляху «з варагаў у грэкі». Таму цеплаходы, паруснікі змогуць і пасля ўводу ГЭС у эксплуатацыю без праблем працягваць хадзіць па Заходняй Дзвіне.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

*Віцебскі раён — Віцебск.*

■




# БУДЗЕМ З ХЛЕБАМ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дзяўчаты ў традыцыйных строях з вяночкамі на галаве раскладвалі прывезеныя караваі на ручніках. На свята, акрамя тысячнікаў, былі запрошаны кіраўнікі ўсіх сельгасгаспадарак раёна.

Шклоўскі раён у вобласці адзін з валаўтваральных па зборы збожжа, а ААТ «Александрыйскае» — адно з перадавых. Героямі дня сталі яго першыя тысячнікі — камбайнеры Вячаслаў Карповіч і Мікалай Рабцаў, а таксама кіроўца Яўген Васільеў.

— Па праваслаўнай традыцыі любая добрая справа пачынаецца з благаславення,— пачаў з малітвы айцец Андрэй. Ён пажадаў сабраць годны ўраджай і акрапіў усіх святой вадой.

Тысячнікам спявалі прыгожыя песні, казалі словы ўдзячнасці і ўручалі падарункі. «Спадзяюся, што і далей ваша праца будзе такой жа плённай,— адзначыў Пётр Руднік падчас віншавання.— Але спаборніцтвы ўжо на старце паказваюць, што атрымаць жоўтую майку лідара будзе не так проста».

— За 5 гадоў сваёй працы ў гаспадарцы я ўпершыню трапіў у лідары,— дзяліўся з журналістамі пасля афіцыйнай часткі вадзіцель гаспадаркі Яўген Васільеў.— Каб дабіцца поспеху, трэба не ленавацца і працаваць больш, чым астатнія. Асабіста я на полі з 6 раніцы і да ночы.

## ПЕРШЫЯ ПА РАПСЕ

Тое, што хлебаробы магілёўскага агракамбіната «Зара» першымі ў краіне пераадолелі тысячны рубеж па намалоце насення рапсу,— таксама паказальны вынік. Прычым услед за першым экіпажам двух Уладзіміраў Корсакаў тысячны рубеж узяў яшчэ адзіны сямейны экіпаж у складзе Уладзіміра і Дзмітрыя Мельнікавых.

— Гэта сведчыць, што тэмпы ўборкі пайшлі ўгору,— радуецца губернатар.— Да канца ўборачнай павінен быць больш важкі вынік, добра калі да першай тысячы нашы пераможцы дададуць яшчэ па 4–5 тысяч.

Дарэчы, калі ў вобласці самая высокая ўраджайнасць па збожжавых менавіта ў ААТ «Александрыйскае» (54,1 ц/га), то па рапсе адзін з лідараў — магілёўскі агракамбінат «Зара» (43 ц/га).

— Ураджай вельмі добры,— усміхаецца Уладзімір Корсак-старэйшы.— Яшчэ дзень-два — і можна будзе пераключацца на збожжавыя. Цяжка, але настрой баявы. А 5-й раніцы ўжо на полі. Жонка таксама падтрымлівае, смачныя абеды гатуе. Праблем з харчаваннем на полі няма, кормяць па поўнай праграме. Але ж ежа з дому, прыгатаваная з любоўю,— зусім іншая справа.

## НЕ ТОЙ ХЛЕБ, ШТО НА ПОЛІ, А ТОЙ, ШТО Ў ГУМНЕ

«Толькі за кошт сучасных тэхналогій, новых падыходаў, правільнай арганізацыі працы, за кошт дысцыпліны і парадку можна дамагчыся добрага ўраджаю,— казаў губернатар журналістам.— Перад хлебаробамі стаіць задача ўбраць увесь хлеб, які сёння ў полі, да зярнятка. Без гэтага не будзе ні малака, ні мяса».

Вялікія спадзяванні кіраўнік вобласці ўскладае на сістэму «кропкавага» земляробства. Сёлета 5 гаспадарак Магілёўшчыны ўкараняюць гэты пакуль яшчэ новы метад. «Ён дазваляе эканоміць мільярды рублёў на адных толькі мінеральных угнаеннях і работах па доглядзе,— падкрэсліў губернатар.— Мінус толькі ў тым, што тэхніка, якая для гэтага патрэбна, каштуе вельмі дорага. Але цяпер вядуцца перамовы аб тым, каб яе вырабляць у нас».

На пытанне, якія вынікі ўборачнай можна чакаць, кіраўнік вобласці пакуль адказвае: не той хлеб, што на полі, а той, што ў гумне. Але тое, што мільённая мяжа будзе пераадолена — гэта адназначна.

Пётр Руднік паставіў перад аграрыямі Магілёўшчыны задачу сабраць хлеб да 15 жніўня. Кожны наступны дзень будзе прыносіць толькі страты, папярэдзіў ён.

Журналісты папрасілі губернатара пракаментаваць тыя сігналы, якія датычацца дэфіцыту гаруча-змазачных матэрыялаў у некаторых гаспадарках. «Усе пытанні па пастаўцы паліва былі вырашаны яшчэ да пачатку ўборачнай,— адказаў ён.— Праблема гаруча-змазачных матэрыялаў узнікае тады, калі на месцах няма добрай арганізацыі працы. На той выпадак, калі не хапае сродкаў, існуе дамоўленасць з прадпрыемствамі аблнафтапрадукта, якія пад гарантыі райвыканкамаў адпускаць паліва. Кожнай вобласці ў пачатку ўборачнай было выдзелена па 50 мільярдаў рублёў. Акрамя гэтага, абласны бюджэт штодня пералічвае на паліва ад 2 да 4 мільярдаў. Трэба не чакаць маны нябеснай, а самім вучыцца зарабляць грошы. Кіраўнік дзяржавы не раз казаў пра тое, што ў сяло ўкладзена шмат грошай. Павінна быць нейкая аддача. Вось у «Зары» ўраджайнасць рапсу 43 ц/га, а па вобласці толькі трохі больш за 20. Гэта сведчыць аб тым, што ў агракамбінаце ўмеюць працаваць з гэтай культурай. І — у прыбытку».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ЗАЎЖДЫ ГАТОВЫЯ ДАПАМАГЧЫ

**У мінулую суботу цэнтр Мінска стаў своеасаблівай пляцоўкай для прэзентацыі службы, якая заўжды гатовая дапамагчы тым, хто трапіў у надзвычайную сітуацыю. Міністэрства па надзвычайных сітуацыях арганізавала на галоўным праспекце сталіцы парад у гонар Дня пажарнай службы.**





На беразе Свіслачы, у Цэнтральным дзіцячым парку імя Горкага ратавальнікі паказалі тэхніку для барацьбы з пажарамі, абсталяванне для тэрміновай эвакуацыі з небяспечнай тэрыторыі, частавалі кашай, прыгатаванай у паходнай кухні. Цікавае выступленне адбылося і на вадзе: хуткія маторныя лодкі, вадалазы — такое ў горадзе бачаць рэдка, але на рэках і азёрах гэтая служба заўжды гатовая прыйсці на дапамогу. Шчодрымі апладысментамі віталі гледачы ўдзельнікаў паказальнага выступлення ўзвода ганаровай варты Камандна-інжынернага інстытута МНС.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**
**Фота аўтара.**

■ Рынак акцый

# БЕЛАРУСКІМ МАЯНЭЗАМ ЗАЦІКАВІЛІСЯ ЗАМЕЖНІКІ?

## Амаль 5,5 тысячы акцый Гомельскага тлушчавага камбіната купіў невядомы замежнік

**Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў Агенцтве дзелавых сувязяў, гэтая прыкметная здзелка адбылася на Беларускай валютна-фондавай біржы 21 ліпеня.**

Нагадаем, што за чатыры дні да гэтага Гомельскі тлушчавы камбінат пачаў адкрыты продаж акцый дадатковага выпуску. І гэта першая буйная купля каштоўных папер гэтага прадпрыемства. Усяго куплена 5430 простых акцый на суму болей за 102 мільёны беларускіх рублёў (каля 10 тысяч долараў).

Дырэктар ААТ «Гомельскі тлушчавы камбінат» Дзмітрый Бабундзін паведаміў Агенцтву дзелавых сувязяў, што ён не здзіўлены фактам куплі пакета акцый прадпрыемства замежнікам. «Прадпрыемства актыўна мадэрнізуецца, новае, больш энергаэфектыўнае і прадукцыйнае абсталяванне ўжо дае вынік. Мы ўтрымліваем значныя долі на беларускім рынку практычна па ўсіх відах прадукцыі, што выпускаецца. Безумоўна, гэта цікава замежным інвестарам. Але пакуль аб'ём куплі акцый нерэзідэнтам паказвае хутчэй яго намер бліжэй пазнаёміцца з нашым акцыянерным таварыствам, скарыстаўшыся правамі акцыянера. А можа, прыватная асоба, якая добра валодае сітуацыяй на фондавым рынку і хоча зарабіць на росце кошту акцый»,— заявіў дырэктар.

Таргі акцыямі прадпрыемства працягнуцца да 1 верасня 2014 года. Кошт адной акцыі — 18 800 рублёў.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■

■ Проста шок

# НЕ БУДЗІЦЕ Ў САБАКУ ЗВЕРА

## РАТВЕЙЛЕР, ЯКІ АДКУСІЎ БАБРУЙЧАНЦЫ РУКУ, НЕ БЫЎ ШАЛЁНЫМ



**Жудасная трагедыя, якая адбылася ў бабруйскай вёсцы Мальева, зноў нагадала пра нашы праблемы ва ўзаемаадносінах з сабакамі. Ратвейлер пазбавіў сваю патэнцыйную гаспадыню рукі. Жанчына ўжо некалькі тыдняў знаходзіцца ў бальніцы. Яе жыццю нічога не пагражае, але руку не вярнуць. Што ж стала прычынай трагедыі?**

Як высветлілася, гаспадар сабакі з'ехаў у Расію і падарыў яго сябру. Той прывёз ратвейлера на дачу (не трымаць жа вялікага сабаку ў гарадской кватэры). Тым больш што з жонкай яны даволі часта наведваюцца ў свае вясковыя ўладанні. Сабака жыў там некалькі месяцаў і прыкмет агрэсіі не выяўляў. Да таго самага злашчаснага дня.

Па словах **начальніка крымінальнага вышуку Бабруйскага РАУС Дзмітрыя СТЭЛЬМАКА,** у гасцях у гаспадыні знаходзілася сяброўка, яны трохі выпілі. І тут прыяцельцы захацелася пагладзіць сабаку. На ласку ён прарэагаваў міралюбна. І гэта… не вельмі спадабалася яго гаспадыні. Жартам яна піхнула яго нагой, але жывёла прарэагавала імгненна — учапілася ёй у руку і стала цягнуць. Перапалоханая сяброўка ў шоку выскачыла з хаты. Яна і папярэдзіла суседку, якая тут жа выклікала міліцыю.

— Мы ўбачылі жудасную карціну,— распавёў Дзмітрый Стэльмак.— Сабака адарваў жанчыне руку і скалечыў другую. Калецтвы нанесены цяжкія, калі б гэта здзейсніў чалавек, яму б пагражала да 7 гадоў пазбаўлення волі. Сабаку вырашана было застрэліць.

У Бабруйскай раённай ветэрынарнай станцыі прызналіся, што падобнага жудаснага выпадку ў іх практыцы яшчэ не было. Вясковыя сабакі часта кусаюць людзей, але не так сур'ёзна. Звычайна гэта здараецца па віне нядбайных гаспадароў, якія спускаюць сабак з ланцуга альбо ўвогуле іх не прывязваюць. І калі староннi чалавек заходзіць у двор, чатырохногі вартаўнік тут жа на яго накідваецца.

З тым, што людзі часта самі вінаватыя ў агрэсіі жывёл, Дзмітрый Стэльмак згодны. А тое, што сабакі не любяць п'яных, ведаюць практычна ўсё. Магчыма, калі б жанчына, якая выпіла, не набліжалася да сабакі, усё было б у парадку.

Дарэчы, ратвейлер, якога прыйшлося прыстрэліць, не быў шалёным. Прынамсі, такі папярэдні вынік атрыманы ў абласной ветлабараторыі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■



■ Погляд

# «КУПІЦЬ ЭЛЕКТАРАТ»

## ЗРАБІЦЬ ГЭТА БЫВАЕ ЧАСАМ СКЛАДАНА, І ТАДЫ Ў ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ ПРА ДЭМАКРАТЫЮ ЗАБЫВАЮЦЬ

**У сусветнай медыя-прасторы сустракаецца шмат слоў-фетышаў, і ці не найбольш зашмальцаванае з іх — «дэмакратыя». Мала хто ведае, што яно насамрэч павінна значыць, для большасці дастаткова афарызма Чэрчыля (між іншым, прэм'ер-міністра Брытанскай Імперыі): «Дэмакратыя — найгоршая форма праўлення, за выключэннем усіх астатніх».**

Сёння шмат краін пазіцыянуюць сябе як узор дэмакратыі, варты для пераймання, і агрэсіўна яго навязваюць. Але пад уздзеяннем сусветнага крызісу павялічваецца колькасць людзей, крайне скептычна настроеных да гэтага дзяржаўнага ладу, яны гавораць пра яго двудушнасць, неэфектыўнасць у крызісных умовах і забюракратызаванасць. Найбольш узбуджаюць незадаволенасць у грамадстве бясконцыя карупцыйныя скандалы, якія рэгулярна скаланаюць асновы грамадскага ладу заходніх дэмакратый — Італіі, Германіі, Польшчы, Літвы…

Можна больш пільна прыгледзецца да досведу Францыі, якая прайшла праз безліч рэвалюцый і павінна была выпрацаваць найбольш дасканалую сістэму дзяржаўнага кіравання — нездарма канстытуцыя 5-й Рэспублікі ўзята за аснову беларускага Асноўнага Закону. Але, на жаль, карупцыйныя скандалы квітнеюць і там: дастаткова ўспомніць Панамскую аферу, справы Ставіскага, Мітэрана, Шырака… Адным з самых брудных скандалаў было знішчэнне рэпутацыі Дамініка Строс-Кана, былога кіраўніка МВФ і верагоднага прэтэндэнта на пост прэзідэнта Францыі. Ён у красавіку 2011 года абвясціў пра крах і шкоднасць Вашынгтонскага кансенсусу (рыначнага фундаменталізму ў стылі гайдараўскіх рэформаў, які ў абавязковым парадку навязваецца ўсім «пераходным эканомікам»), а ўжо ў маі яго арыштавалі па фальшывым абвінавачванні ў згвалтаванні пакаёўкі. На нашых вачах разыгрываецца скандал вакол Нікаля Сарказі, які «выпадкова» ўспыхнуў пасля з'яўлення інфармацыі аб яго высокіх шанцах на бліжэйшых прэзідэнцкіх выбарах. Цяпер гаворка ідзе пра сумніўнае фінансаванне яго даўняй выбарчай кампаніі лівійскім лідарам Муамарам Кадафі і ўладальніцай «Л'Орэаль» Ліліян Бетанкур.

**Свядомая апора ўлады на народ прадвызначыла сацыяльна-эканамічныя поспехі Беларусі на фоне астатніх удзельнікаў СНД: традыцыйна наша краіна мае найвышэйшыя індэксы развіцця чалавечага патэнцыялу і сацыяльнага прагрэсу.**

Усе гэтыя брыдкія гісторыі — вяршыня айсберга, што сведчыць пра сур'ёзныя праблемы сучаснага варыянту дэмакратыі заходніх краін. Па вялікім рахунку, там амаль не засталося рэальнай канкурэнцыі ідэй і барацьбы партый. Ёсць толькі супрацьстаянне транснацыянальных фінансавых груп, якія ладзяць і аплочваюць шумныя палітычныя і перадвыбарчыя шоу. Праблема ў тым, што сучасная дэмакратыя — зусім не тое, што разумелася пад ёй у часы старажытнай Грэцыі. Галоўная розніца — у маштабах: у грэчаскім полісе выбаршчыкамі з'яўляліся далёка не ўсе жыхары, а кожны выбаршчык ведаў кандыдатаў асабіста і здаўна, таму маніпуляваць меркаваннямі электарату было вельмі складана. Гэта быў век прамой і арганічнай дэмакратыі — улады народа. У сучасным свеце выбаршчыкамі з'яўляюцца мільёны чалавек проста па факце працяглага знаходжання ў межах той ці іншай дзяржавы. Маніпуляваць іх прыхільнасцямі элементарна: электарат даўно разглядаецца прафесійнымі паліттэхнолагамі не як крыніца ўлады, а як рэсурс для куплі і продажу. Там, дзе магчыма падмацаваць жаданыя дзеянні эліты народным волевыяўленнем — гэта забяспечваецца з дапамогай прамыўкі мазгоў і подкупу электарату, укідання кампрамату, шантажу і г. д.

Але калі «купіць электарат» занадта складана ці празмерна дорага, тады думкай народа адкрыта грэбуюць: так у Заходняй Еўропе, насуперак настроям шырокіх народных мас, працісківаюць адмену смяротнага пакарання, легалізацыю наркаманіі, прастытуцыі, празмернай міграцыі, аднаполых шлюбаў, ювенальнай юстыцыі і г. д. У падобных выпадках пра дэмакратыю забываюць і з усмешкай заяўляюць, што «народ яшчэ не саспеў, таму ўлада павінна праявіць палітычную волю і сталасць, каб павесці «адсталых» людзей за сабой». Тыя ж краіны, якія насуперак ціску наднацыянальных эліт прыслухоўваюцца да меркавання народа па складаных пытаннях, трапляюць пад міжнародныя санкцыі. Са свежых прыкладаў можна згадаць швейцарскі «нязручны» плебесцыт-2014, які абмежаваў прыток мігрантаў, што адразу ж выклікала эканамічныя санкцыі супраць гэтай невялікай альпійскай краіны.

На гэтым фоне папрокі на адрас маладой беларускай дзяржавы ў нейкай «недэмакратычнасці» гучаць фальшыва, асабліва калі прыгадаць, што ў часы станаўлення нашай незалежнасці было праведзена тры рэферэндумы, якія заклалі на дзесяцігоддзі кірунак развіцця краіны. Дзякуючы гэтаму, Беларусь трывала кіруецца ўласнымі інтарэсамі, захоўвае і прымнажае індустрыяльную моц, харчовую бяспеку, а галоўнае — абараназдольнасць і саюзніцкія адносіны з Расіяй. Свядомая апора ўлады на народ прадвызначыла сацыяльна-эканамічныя поспехі Беларусі на фоне астатніх удзельнікаў СНД: традыцыйна наша краіна мае найвышэйшыя індэксы развіцця чалавечага патэнцыялу і сацыяльнага прагрэсу.

Вядома ж, праблем хапае і ў нас, у тым ліку і карупцыйных, і гэтыя хваробы варта лячыць з улікам пазітыўнага і негатыўнага вопыту заходніх краін. Моцная суб'ектнасць нашай дзяржавы дае нам эфектыўны інструментарый для барацьбы з гэтым грамадскім злом. Аптымізацыя органаў улады і павелічэнне празрыстасці іх працы павінна грунтавацца на ўмацаванні народаўладдзя, таму, перш за ўсё, трэба гадаваць сваіх выбаршчыкаў, здатных адчуваць і браць адказнасць за сваю краіну.

Тэхнічны прагрэс дае магчымасці вярнуць дэмакратыі першапачатковы сэнс прамой улады народа праз пашырэнне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Электроннае галасаванне паляпшае камунікацыю электарату са сваімі абраннікамі, узмацняе зваротную сувязь, робіць яе больш аператыўнай. Добра, што ў Беларусі ўжо шмат зроблена па стварэнні «электроннага грамадства», і гэта адзначаюць нават у Эстоніі, якая з'яўляецца адным з еўрапейскіх лідараў па прасоўванні новых тэхналогій.

Праца па ўдасканаленні сістэмы дзяржаўнага кіравання, павелічэнні яе эфектыўнасці, насычэнні яе духам сапраўднай дэмакратыі можа стаць агульным пунктам парадку дня для беларуска-еўрапейскага дыялогу. Галоўнае, каб гэты дыялог вёўся па-партнёрску, з роўных пазіцый, без палітычнага і эканамічнага ціску і навязвання сваіх мадэляў як адзіна правільных.

**Аляксандр СІНКЕВІЧ**

■

■ Беражыце сябе!

# ЧЫГУНКА ПАМЫЛКІ НЕ ДАРУЕ

## Грамадзяне з-за асабістай бесклапотнасці становяцца ахвярамі няшчасных выпадкаў

**На чыгунцы з пачатку года назіраецца рост няшчасных выпадкаў. Міліцыя ўжо зафіксавала больш за 100 фактаў траўматызму і гібелі людзей пад коламі цягнікоў. Пры гэтым прагноз праваахоўнікаў несуцяшальны: у летні перыяд здарэнняў можа стаць больш. І звязана гэта, перш за ўсё, з павелічэннем пасажырапатоку ў дызелях і электрычках прыгарадных зносін з надыходам дачнага і адпускнога сезона, а таксама летніх школьных канікул.**

— У першым паўгоддзі колькасць пацярпелых у выніку няшчасных выпадкаў вырасла амаль на 13% у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года, — канстатуе намеснік начальніка аддзела ўпраўлення арганізацыі забеспячэння грамадскай бяспекі на аб'ектах транспарту падпалкоўнік міліцыі Генадзь Ворса. — Пры гэтым 53 чалавекі загінулі, 37 траўмаваны і 6 скончылі жыццё самагубствам. Турбуе і тое, што амаль палова ўсіх пацярпелых і загінулых трапілі пад цягнік п'янымі.

Самымі распаўсюджанымі прычынамі невытворчага траўматызму з'яўляюцца перасячэнне чыгуначных шляхоў у неўстаноўленым месцы і парушэнне мер бяспекі пры пераходзе магістралі на пешаходных насцілах. Нярэдка трагедыі здараюцца і з тымі, хто ляжыць альбо сядзіць на рэйках. Дарэчы, часцей за ўсё няшчасныя выпадкі міліцыянеры фіксуюць у вячэрні і начны час.

У мэтах папярэджання здарэнняў транспартная міліцыя праводзіць розныя прафілактычныя мерапрыемствы. Найбольш маштабнае з іх — спецаперацыя «Бяспека».

— За пяць дзён у мінулым месяцы мы ўзмацнілі кантроль на 1061 аб'екце чыгуначнага транспарту, — працягвае Генадзь Ворса, — спынілі 536 парушэнняў ПДР, прыцягнулі нядбайных пешаходаў да адміністрацыйнай адказнасці, затрымалі больш за 200 чалавек у нецвярозым стане. Усяго за няправільны пераход сталёвых магістраляў пакарана амаль 6,5 тысячы грамадзян.

Яшчэ адна праблема на чыгунцы — дарожна-транспартныя здарэнні. За паўгода іх адбылося 11. У выніку аварый адзін грамадзянін загінуў і 4 атрымалі траўмы.

— Прычыны дарожна-транспартных здарэнняў банальныя, — кажа Генадзь Ворса. — У большасці выпадкаў вадзіцелі ігнаруюць правілы перасячэння пераездаў, у тым ліку рухаюцца на забараняльны сігнал светлагукавога святлафора.

За такія правапарушэнні ў гэтым годзе супрацоўнікі транспартнай міліцыі і ДАІ склалі каля 1000 (у 2013-м — 726) адміністрацыйных протаколаў з наступным накладаннем штрафаў.

**Аляксандр МАРЧАНКА**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

■ Старонкі гісторыі

# «Мінская міліцыя была ўзорнай у Саюзе»

## Як у сталіцы змагаліся з пешаходамі-парушальнікамі і лавілі рабавальнікаў



«Я імкнуўся, каб кожны начальнік клапаціўся пра сваіх падначаленых».

**18 жніўня сталічная міліцыя адзначыць сваё 70-годдзе. Напярэдадні святкавання сваімі ўспамінамі аб працы ў сталічных праваахоўных органах са «Звяздой» шчыра падзяліўся Віктар ПІСКАРОЎ, былы міністр унутраных спраў БССР, які да таго ж на працягу 12 гадоў узначальваў Упраўленне ўнутраных спраў Мінскага гарвыканкама.**

***— Віктар Аляксеевіч, ці добра памятаеце тыя часы, калі ўпершыню трапілі ў Мінск?***

— Гэта адбылося ў сярэдзіне 50-х, а пачалася мая кар'ера ў міліцыі яшчэ на Палессі. У 1951 годзе мяне, камсамольца, накіравалі на службу і прызначылі памочнікам начальніка палітчасці ўпраўлення міліцыі Палескай вобласці. У той час праваахоўныя органы былі ўкамплектаваны былымі франтавікамі, партызанамі. Зразумела, без вопыту і адукацыі, — але мелі яны вялікую волю. Напрыканцы 50-х большасць супрацоўнікаў міліцыі ўсё ж такі атрымала сярэднюю адукацыю. Аддзяленні сталічнай міліцыі спачатку пераважна месціліся ў драўляных бараках, а ўжо пасля былі пераведзены ў больш камфортныя памяшканні.

Калі да нас прыязджалі журналісты з ЗША, я ім прыводзіў статыстыку: з 1962 па 1982 год насельніцтва сталіцы Беларусі павялічылася ў два разы, а злачыннасць зменшылася ў тры разы! Хаця, як усе добра ведаюць, рост злачыннасці абумоўлены ростам насельніцтва. У той час, дзякуючы намаганням Кірыла Мазурава, Панцеляймона Панамарэнкі, Пятра Машэрава атрымалася ператварыць Беларусь у адну з самых развітых савецкіх рэспублік і ў прамысловасці, і ў сельскай гаспадарцы.

***— Цікава, а як у той час жылося міліцыянерам?***

— Заробак у міліцыі ніколі не быў высокім. Аднак былі пэўныя льготы. Напрыклад, міліцыянеры аплочвалі толькі 50 працэнтаў ад усіх камунальных плацяжоў. Таксама нашы супрацоўнікі мелі права на бясплатныя пуцёўкі на адпачынак, бясплатны праезд у грамадскім транспарце. Дарога да санаторыя, між іншым, таксама аплочвалася. З часам льготы ў міліцыянераў зніклі, а заробак так і застаўся ранейшым.

***— Вы, напэўна, добра памятаеце, што было бічом мінскай злачыннасці?***

— Злачыннасць у Мінску характарызавалася крадзяжамі. Яны складалі 70-75 працэнтаў ад агульнай колькасці злачынстваў. На ўсё жыццё ў памяці засталася адна гісторыя. Аднойчы ў горадзе пайшла серыя крадзяжоў матэрыяльных каштоўнасцяў. Кожную пятніцу мы атрымлівалі па два-тры рабаванні! Мы паразважалі, прыкінулі, што дзейнічаць можа шайка, якая ў выхадныя з'язджае і збывае нарабаванае. Мяне нават пераканалі паставіць пост каля вялікага дома на вуліцы Прытыцкага, але нават з ім мы ўсё роўна былі вымушаны зафіксаваць яшчэ адзін крадзеж. Урэшце іх затрымалі — у рэстаране «Патсдам». Злачынцамі аказаліся хлопцы з даволі гаваркімі прозвішчамі — Чалпанаў і Варганаў.

Што тычыцца забойстваў, большасць з іх мелі бытавую глебу. Таксама быў пэўны перыяд, калі паміж людзьмі актыўна распаўсюджвалася вера ў пагалоскі. У раёне камвольнага камбіната аднойчы судзілі злачынцу за згвалтаванне дзяўчыны. А па горадзе пайшлі чуткі пра яго вызваленне. У выніку натоўп акружыў суд, крычаў, завязалася бойка, і мы ледзь паспелі вырвацца адтуль і вывезці асуджанага.

***— А ці былі ў сталіцы раёны, якія вызначаліся высокім узроўнем злачыннасці?***

— Такіх не было. У нас наогул па ўсім горадзе быў вельмі добры ўзровень узаемадзеяння жыхароў з міліцыяй.

А вось чым далей мы адыходзілі ад вайны, тым больш яскрава мяняўся тып злачынцы. У сталіцы ў савецкія часы былі і крадзяжы, і забойствы, і хуліганствы. Не было толькі нарказлачынстваў. Неяк з прапановай навесці парадак з пешаходамі на дарогах сталіцы да мяне звярнуўся Мікалай Слюнькоў, тагачасны першы сакратар Мінскага гаркама партыі. На асабліва «баявых» пераходах мы выстаўлялі да 10 інспектараў! Штрафавалі за год па паўмільёна чалавек. Памятаю, як тэлефануе мне адзін з міністраў і ледзь не крычыць у слухаўку: «Маю жонку аштрафавалі!». А я яму адказваю: «Няхай дзякуе Богу, што жывая засталася! Маю тройчы штрафавалі. Няхай ходзіць на зялёны, а стаіць на чырвоны. Больш мне не звані!» А цяпер мне прыемна ад таго, што ідзеш па вуліцы, людзі паводзяць сябе дысцыплінавана і прапускаюць машыны. А калі нехта і перабягае дарогу, дык гэта хутчэй выключэнне з правілаў.

***— Віктар Аляксеевіч, у агульным плане Мінск быў крымінагенным горадам?***

— Не! І па супрацоўніках, і па сітуацыі наш горад быў узорным у маштабе Міністэрства ўнутраных спраў СССР. Па барацьбе са злачыннасцю нам атрымалася зрабіць яго адным з лепшых у Саюзе, што пацвярджалі міністры Мікалай Шчолакаў, Віталь Федарчук, Аляксандр Уласаў, якія наведвалі сталіцу.

***— На якія рэчы вы рабілі ўпор у рабоце ў міліцыі?***

— На непасрэднай працы з супрацоўнікамі. Я імкнуўся, каб кожны начальнік клапаціўся пра сваіх падначаленых, шукаў для службы людзей, якія ў цяжкіх абставінах здолеюць «захаваць твар». Пры мне з гарадской міліцыі выйшлі больш за 20 генералаў! Гэта цэлая плеяда людзей, якія ўкладвалі сваю душу ў агульную справу. Але пытанне камплектацыі як стаяла раней, так і стаіць сёння перад намі. На жаль, не так шмат людзей, у тым ліку і ў міліцыі, якія глыбока разумеюць цяжкасць і адказнасць службы міліцыянера. Раней як адбіралі ў праваахоўныя органы? Разважалі: «Гэты не мае судзімасцяў, у міліцыю не дастаўляўся, а значыць — падыходзіць»! Але гэта ўсё фармальна, знешнія фактары, а іх не толькі недастаткова, яны наогул не характарызуюць чалавека, яго здольнасць служыць у міліцыі. Тым больш міліцыя часта мае справу з так званымі адкідамі грамадства: хуліганамі, рабаўнікамі, наркаманамі... І вельмі важна міліцыянеру вытрымаць перад спакусай, праявіць характар і паўплываць на сітуацыю. Любы супрацоўнік міліцыі павінен мець багаты жыццёвы вопыт. У іншым выпадку што малады ўчастковы здолее зрабіць для людзей? Так, тэарэтычна ён будзе падрыхтаваны, але ж гэта не ўсё... Што тычыцца камплектавання прававых класаў, неабходна бачыць не толькі жаданне самога вучня, а ўяўляць сабе яго ўнутраную гатоўнасць да такой адказнай працы. Бо ёсць тыя рысы характару, якія закладваюцца нам толькі татам і мамай.

**Тарас ШЧЫРЫ**

■ Стоп наркотыкам!

# «ІМПАРТ» ДУРМАНУ

## Толькі за паўгода канфіскавана больш за 50 кг наркотыкаў і псіхатропаў



**Паводле інфармацыі ўпраўлення па наркакантролю і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС Беларусі, за 6 месяцаў гэтага года ў нашай краіне зарэгістравана звыш трох з паловай тысяч нарказлачынстваў. Больш за 97 працэнтаў з іх непасрэдна звязаныя з незаконным абарачэннем наркотыкаў. З нелегальнага абароту канфіскавана звыш 22 кг наркатычных сродкаў і каля 30 кг псіхатропных рэчываў.**

Асноўная маса наркотыкаў па-ранейшаму пступае ў нашу краіну з-за мяжы. Нелегальныя пастаўкі ажыццяўляюць міжнародныя арганізаваныя злачынныя групы, выкарыстоўваючы складаныя схемы, кур'ераў, транспарт са схованкамі. У гэтым годзе ўжо перакрыты 21 канал транзіту і паставак дурману. Праз тэрыторыю Беларусі ажыццяўлялася кантрабанда амфетаміну, марыхуаны і гашышу ў Расійскую Федэрацыю з краін Еўрасаюза. Асноўнай краінай-пастаўшчыком наркотыкаў і псіхатропаў у нашу краіну непасрэдна для ўнутранага збыту па-ранейшаму з'яўляецца Расія, з тэрыторыі якой увозяцца не толькі «традыцыйныя» для гэтага рэгіёна гераін і метадон, але таксама гашыш, амфетамін і іншыя псіхатропныя рэчывы новага пакалення, якія раней актыўна пастаўляліся з Прыбалтыкі і Польшчы.

Так, у адным з дамоў па вул. Кальцова ў Мінску барацьбы з наркалзлачыннасцю з Першамайскага РУУС сумесна з супрацоўнікамі спецпадраздзялення па барацьбе з тэрарызмам «Алмаз» падчас правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў па спыненні канала пастаўкі наркатычных сродкаў з Расіі ў Беларусь затрымалі 24-гадовага мінчаніна. У яго было знойдзена і канфіскавана 360 г гашышу. Цяпер маладому чалавеку пагражае да 13 гадоў пазбаўлення волі.

А ў канцы чэрвеня супрацоўнікі ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі УУС Віцебскага аблвыканкама ў ходзе правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў па перакрыцці канала пастаўкі наркатычных сродкаў з Пскова (Расійская Федэрацыя) затрымалі ў Віцебску грамадзяніна 1978 г.н. Пры асабістым вобыску ў яго выявілі 0,43 г амфетаміну. Яшчэ 800 г псіхаактыўных рэчываў мужчына захоўваў у сябе дома.

Усё часцей наркадзялкі спрабуюць арганізаваць нелегальную вытворчасць наркотыкаў і псіхатропаў непасрэдна ў Беларусі. Сёлета супрацоўнікамі органаў унутраных спраў спынена дзейнасць 11 падпольных наркалабараторый, выяўлена 7 памяшканняў, спецыяльна прыстасаваных для вырошчвання наркатычных раслін.

У пачатку сакавіка 2014 года за незаконнае абарачэнне наркотыкаў было заведзена адразу некалькі крымінальных спраў у дачыненні да жыхара Мінска. Супрацоўнікі наркакантролю Ленінскага РУУС сталіцы ва ўзаемадзеянні з калегамі з ГУУС і СПБТ «Алмаз» у арандаванай ім кватэры знайшлі 5 кг «спайсу», 100 г парашку, які змяшчае асабліва небяспечны псіхатроп «Альфа-PVP», 6500 так званых «марак». Літаральна на наступны дзень у гаражы, які арандаваў наркадзялок, ахоўнікі правапарадку выявілі яшчэ 3 кг курыльнай сумесі, 100 г парашку з «Альфа-PVP», 60 кг расліннага рэчыва, якое выкарыстоўваецца ў якасці асновы для вырабу «спайсу», а таксама лабараторнае абсталяванне.

З мэтай недапушчэння распаўсюджвання наркатычнай сыравіннай базы расліннага паходжання МУС штогод праводзіць спецыяльную праграму «Мак», падчас якой вядзецца праца па выяўленні і знішчэнні пасеваў раслін маку і каноплі.

У чэрвені гэтага года ў рамках рэалізацыі спецпраграмы «Мак» знішчана больш за 66 тон раслін, у састаў якіх уваходзяць наркотыкі, на плошчы каля 36 га.

За парушэнне патрабаванняў Дэкрэта «Аб некаторых пытаннях дзяржаўнага рэгулявання абарачэння насення маку» сёлета складзена 98 адміністрацыйных пратаколаў у дачыненні да 83 асоб. З незаконнага абарачэння канфіскавана звыш 39 тон гэтага прадукту, накладзена штрафаў на суму 745 мільёнаў беларускіх рублёў, канфіскавана 6 аўтамабіляў, на 12 аўто накладзены арышт.

У Міністэрстве ўнутраных спраў занепакоены ростам колькасці нарказлачынстваў, якія здзяйсняюцца з удзелам непаўналетніх. За 6 месяцаў гэтага года выяўлена 210 такіх злачынстваў, што ў пяць разоў больш за аналагічны перыяд мінулага года.

Цяпер каля 70 працэнтаў канфіскаваных рэчываў складаюць курыльныя сумесі. Амаль усе яны маюць у саставе псіхатропныя рэчывы, пераважная большасць з якіх забаронена да свабоднага абарачэння на тэрыторыі Беларусі.

У 2014 годзе пералік наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і іх прэкурсораў, якія падлягаюць дзяржаўнаму кантролю ў Беларусі, дапоўнены 68 новымі псіхатропнымі рэчывамі. Акрамя таго, у чэрвені гэтага года ў Міністэрства аховы здароўя накіравана прапанова аб уключэнні ў названы пералік яшчэ 8 новых псіхатропных рэчываў.

У МУС упэўнены, што такія захады дадуць магчымасць у перспектыве істотна аздаравіць наркасітуацыю ў Беларусі.

**Вольга ЧАМКО**



Фота Надзеі БУЖАН.

■ Пасля службы

# РЭДКАЕ ХОБІ ТАЛСТОГА

## ЯК ЗРАБІЦЬ СА ЗЛОЎЛЕНАЙ РЫБЫ СУВЕНІР?

**Валерый Талстой, старшы оперупаўнаважаны аддзялення крымінальнага вышуку Шумілінскага раённага аддзела ўнутраных спраў, у вольны час захапляецца рыбалкай і таксідэрміяй рыб. Апошняе — даволі рэдкае хобі.**



Безумоўна, пры знаёмстве я не мог не запытаць: мо маёр міліцыі — нашчадак славутага пісьменніка? Ён сціпла прызнаўся, што дакладна ведае сваіх продкаў да трэцяга калена, а глыбей... Хутчэй за ўсё, са знакамітым графам яны цёзкі, і не болей.

Дарэчы, сярод цытат вядомых людзей пра рыбалку аўтар гэтых радкоў знайшоў трохі ад Талстога: «Пасля ад'езду доктара Сяргей Іванавіч пажадаў ехаць з вудай на раку. Ён любіў вудзіць рыбу і як быццам ганарыўся тым, што можа любіць такі дурны занятак». Для Валерыя Талстога, які на працы, можна лічыць, таксама «рыбак»: ловіць усякую «крымінальную рыбу», рыбалка — добры спосаб адпачыць, а таксідэрмія — вельмі захапляльны занятак. Было б з чаго рабіць чучалы! Калі ёсць магчымасць, Валерый адразу едзе на рыбныя месцы, якіх ведае нямала.

**Расказваючы пра сваю самую вялікую па памерах і вазе рыбу, мой суразмоўца хваляваўся, што не паверу. Летась у кастрычніку ён злавіў шчупака вагой 8,4 кілаграма.**

— Родам я з Бешанковіч. Там і сёння мае бацькі жывуць. Бацька, Леанід Рыгоравіч, дзякуй Богу, поўны сіл, працуе будаўніком. Святлана Іванаўна, мама, хоць і на пенсіі, але па-ранейшаму працуе швачкай. У гарадскім пасёлку Бешанковічы я скончыў школу, адтуль пайшоў служыць у армію. Потым вучыўся ў Магілёўскай сярэдняй школе міліцыі. Па размеркаванні трапіў у Шуміліна. У нас з жонкай Аксанай (яна да дэкрэтнага водпуску працавала ў раённым аддзеле адукацыі начальнікам метадычнага кабінета. — **Аўт.**) два хлопчыкі. Уладу — 9 гадоў, Дзіму — 2 гады і 7 месяцаў. Вядома, старэйшага сына, калі вельмі просіцца, бяру на рыбалку, ды пакуль, відаць, зарана. Хлопчык хутка стамляецца, ды ж яшчэ і камары кусаюць *(смяецца)*. Я сябе добра памятаю ў такім узросце: бацька гадзінамі лавіў, а я жаб на беразе ганяў, — расказвае Валерый Леанідавіч.

Наогул, мой герой — чалавек з пачуццём гумару. Мо таму чамусьці раптам падчас нашай гутаркі ўспомнілася савецкая камедыя «Трое ў лодцы, не лічачы сабакі». Памятаеце эпізод, калі ў кавярні ўсе расказвалі па чарзе пра гіганцкую па памерах рыбу, якая вісела на сцяне? Кожны — што ён злавіў. А калі рыба ўпала, аказалася, што яна з гіпсу. Разам з Валерыем Леанідавічам пасмяяліся, калі ўспомнілі гэта.

Расказваючы пра сваю самую вялікую па памерах і вазе рыбу, мой суразмоўца хваляваўся, што не паверу. Летась у кастрычніку ён злавіў шчупака вагой 8,4 кілаграма.

Вопытны рыбак шчыра падзяліўся сакрэтамі, чым і на што ловіць. Часцей за ўсё рыбачыць на маторцы. Таксідэрміяй зацікавіўся нечакана.

— Ніхто мяне не вучыў. Нешта прачытаў, сюжэты па тэлебачанні паглядзеў і вырашыў паспрабаваць. З некалькіх шчупакоў ужо зрабіў чучалы, ды дома толькі адзін застаўся. Цесцю аднаго падарыў, сябрам — яшчэ парачку...

Зрабіць чучала рыбы не так ужо і складана, сцвярджае Талстой і з ахвотай раскрывае сакрэты таксідэрміста.

Рыбе адразаюць галаву, выразаюць з яе мяса, жабры. Потым галаву трэба пакласці ў соль або ў саляны раствор. У апошнім солі павінна быць дастаткова, каб яна ўжо больш не растваралася. Некаторыя таксідэрмісты, каб праверыць, ці хапае солі, кідаюць у ваду яйка. І калі яно не тоне, солі больш не трэба. Каб добра «засалілася» тая галава, трэба пачакаць 1,5-2 тыдні. Потым «нарыхтоўку» трэба добра прамыць у халоднай вадзе і пакласці прыкладна на суткі ў каструлю з вадой. Перыядычна неабходна мяняць ваду і абмываць галаву. Галоўнае, каб лішняя соль уся выйшла, інакш, калі потым будзеце пакрываць лакам, соль будзе праступаць на паверхні галавы, што сапсуе ўвесь выгляд.

— Пасля апрацоўкі соллю бяром рыбную галаву, расцягваем жабры і прыкладваем да кавалка драўняна-стружкавай пліткі або дошкі, у якой загадзя зроблены дзірачкі. Ніткамі галаву прышываем. Пашчу рыбы фіксуем з дапамогай палачак ці алоўкаў. З вачыма я нічога не раблю. Ведаю, што можна вочы ад лялькі ўстаўляць, але ў мяне і так атрымліваецца добра. У чучал маіх рыб вочы натуральныя. Звычайна лаўлю шчупака для таксідэрміі ў перыяд жору: у кастрычніку, лістападзе, калі часцей за ўсё ўжо ёсць ацяпленне ў кватэры. Дошку з галавой рыбы прывязваю да батарэі або кладу наверх. Калі яна поўнасцю высыхае, становіцца як камень. Значыць, гатовая да афарбоўкі лакам... Лак бяром бясколерны.

Валерый запрасіў яшчэ раз у госці. Трэба будзе выбрацца... Мо і на рыбалку возьме, а потым пакажа ў дэталях, як рабіць прыгожы сувенір?

Жонка Валерыя Аксана дадала, што ён яшчэ і добры кухар: калі рыбу зловіць — смачная страва гарантавана. Да захапленняў мужа ставіцца... Ну, перыядычна, як многія жанчыны трохі незадаволеная бывае: «Зноў на рыбу ідзеш, каб дома нічога не рабіць?!» Але, безумоўна, яна ганарыцца такім мужам. Валявы чалавек, якога паважаюць калегі, але баяцца злачынцы — такі ён, Талстой з Шуміліна.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

*Шуміліна — Віцебск*

# НЕ «КАТАЦЦА»...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па віне веласіпедыстаў сёлета, за першае паўгоддзе, здзейснены 72 дарожна-транспартныя здарэнні. А гэта на 12,5 працэнта больш за леташнія паказчыкі. Падобная праблема найбольш актуальная для Мінскай, Гродзенскай і Гомельскай абласцей. Ва ўсіх ДТЗ загінулі 7 веласіпедыстаў і паранены 66. Рэзкі ўсплеск дарожна-транспартных здарэнняў летась зафіксаваны з чэрвеня да канца жніўня. Самым аварыйным месяцам летась і пазалетась быў ліпень. За гэты месяц у 2012 годзе загінулі 12 веласіпедыстаў, праз год — 11. Па статыстыцы найбольш небяспечным днём па колькасці ДТЗ для веласіпедыстаў з'яўляецца пятніца, а па цяжкасці наступстваў — субота. Найбольшая колькасць дарожна-транспартных здарэнняў з веласіпедыстамі здзяйсняецца ў светлы час сутак. За мінулы год такіх было 244.

**— Напэўна, асобна стаіць праблема п'яных веласіпедыстаў...**

— Але сёлета іх не так шмат. Калі раней п'яным быў ледзь не кожны другі «аварыйны» веласіпедыст, цяпер з 72 здарэнняў толькі 9 адбыліся з удзелам нецвярозых людзей.

**— Гэта, безумоўна, радуе. Аднак аматары велашпацыраў часам таксама скардзяцца: напрыклад на недахоп адмысловых дарожак.**

— Падобныя рэчы наўрад ці назавеш навaўвядзеннем. Веладарожкі навеяны часам, неабходнасцю. І ў гэтым пытанні мы пастаянна кантактуем з мясцовымі ўладамі. Літаральна ўвесь Мінск пакрыты веладарожкамі. Уздоўж дарог у іншых населеных пунктах таксама праходзяць велашляхі. Галоўнае — правільна развесці патокі веласіпедыстаў і вадзіцеляў, каб яны не перасякаліся на праезнай частцы. У такім разе веласіпедыст не будзе перашкаджаць кіроўцам аўтамабіляў і ствараць пагрозу для ўсіх удзельнікаў дарожнага руху.

**— Вы неяк падкрэслілі, што людзі не ездзяць на веласіпедах, а менавіта «катаюцца».**

— Так, бо робяць гэта вымушана ці дзеля ўласнага задавальнення. Пры гэтым адзінкі знаходзяць час на тое, каб прачытаць правілы. Між іншым, згодна з нашым заканадаўствам, дзеці да 14 гадоў без суправаджэння дарослага наогул не маюць права выязджаць на дарогу. Аднак дзеля таго, каб самастойна выехаць на праезную частку, неабходна ведаць элементарныя правілы дарожнага руху. То бок тыя, якімі кіруюцца вадзіцелі. Даросламу велааматару не перашкодзіла б таксама падумаць перад выездам: а ці здолее ён заарыентавацца ў складанай дарожнай сітуацыі? Асабліва трэба падкрэсліць тое, што павінен ведаць кожны веласіпедыст. Правілы дарожнага руху загадваюць рухацца менавіта па веладарожцы. А калі яе няма, ехаць трэба па абочыне, тратуары ці па пешаходнай дарожцы і не ствараць пры гэтым праблем для руху пешаходаў. Калі прыходзіцца ехаць непасрэдна па дарозе, нельга ад'язджаць далей за метр ад правага краю. Гэта павінна стаць аксіёмай.

У сваю чаргу мы ўсімі даступнымі спосабамі імкнемся праз друк, інтэрнэт расказваць пра гэтыя правілы. Што тычыцца велаакцый, у Мінску, напрыклад, пры непасрэднай падтрымцы кампаніі Velcom узнік праект velocity, пад эгідай якога адбываецца таксама навучанне веласіпедыстаў. Яны здаюць залікі па тэорыі і па практыцы, а пасля атрымліваюць спецыяльныя пасведчанні. Гэта добрая магчымасць разбудзіць у людзях прававую свядомасць, нагадаць пра адказнасць, дарожныя пасткі, якія чакаюць веласіпедыстаў. Такія мерапрыемствы насамрэч дапамагаюць.

**Тарас ШЧЫРЫ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ТРЭБА ВЕДАЦЬ

**— У веласіпеда павінна быць спраўная тармазная сістэма, рулявое кіраванне і гукавы сігнал. Яго неабходна абсталяваць люстэркам задняга бачання, прымацаваць спераду белы святлоадбівальнік, а ззаду — чырвоны, з кожнага боку — аранжавы.**

**— Усім веласіпедыстам у мэтах асабістай бяспекі нават пры дзённым свеце рэкамендавана выкарыстоўваць камізэлькі павышанай бачнасці.**

**— Нельга ездзіць, не трымаючыся за руль.**

**— На веласіпедзе дазволена перавазіць толькі дзяцей ва ўзросце да 7 гадоў у дадатковым крэсле, абсталяваным падножкамі.**

**— Забараняецца катацца на раме і багажніку, прывязваць да веласіпеда староннія прадметы.**

**— Веласіпедысту нельга рухацца па дарозе ва ўмовах снегападаў, завей і галалёдзіцы.**

**— Веласіпедыстам дазволена перавозіць груз, але ён не павінен перашкаджаць кіраваць транспартным сродкам і выступаць больш чым на паўметра па даўжыні і шырыні за габарыты веласіпеда.**

**— Калі трэба перасекчы дарогу па пешаходным пераходзе, трэба пераходзіць яе, як звычайны пешаход, весці веласіпед каля сябе.**

## Закон Рэспублікі Беларусь

# АБ УНЯСЕННІ ЗМЯНЕННЯЎ І ДАПАЎНЕННЯЎ У НЕКАТОРЫЯ ЗАКОНЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ПЫТАННЯХ ЗАБЕСПЯЧЭННЯ БЯСПЕКІ ДАРОЖНАГА РУХУ

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрвеня 2014 г.*
*Ухвалены Саветам Рэспублікі 26 чэрвеня 2014 г.*

**Артыкул 1.** Унесці ў кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях ад 21 красавіка 2003 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 63, 2/946, № 87, 2/980; 2006 г., № 111, 2/1242; 2010 г., № 16, 2/1651; № 300, 2/1750) наступныя змяненні і дапаўненні:

1. У артыкуле 4.9:

у частцы 1:

словы «выпадку» і «часткай 3» замяніць адпаведна словамі «выпадках» і «часткамі 3 і 4»;

пасля слова «руху» дапоўніць частку словамі «, парушэнні правілаў прыпынку або стаянкі»;

словы «або сродкамі фота- і кіназдымкі, відэазапісу» выключыць;

у частцы 4 словы «Асоба, названая ў частцы 1 гэтага артыкула, лічыцца, што не падвяргалася адміністрацыйнаму спагнанню» замяніць словамі «Уласнік (уладальнік) транспартнага сродку не падлягае адміністрацыйнай адказнасці».

2. Частку 5 артыкула 7.1 выключыць.

3. У заўвазе да артыкула 18.9 словы «прызначанае» і «ім» замяніць адпаведна словамі «прычэп да яго, прызначаныя» і «іх».

4. У артыкуле 18.12:

абзац другі часткі 1 пасля слова «памеры» дапоўніць словамі «ад адной»;

у частцы 5:

у абзацы першым словы «Нясвоечасовыя рэгістрацыя або перарэгістрацыя транспартнага сродку, або непрадастаўленне яго без уважлівай прычыны ў вызначаны тэрмін для дзяржаўнага тэхнічнага агляду, або кіраванне» замяніць словам «Кіраванне»;

у абзацы другім словы «цягнуць» і «да дзвюх» замяніць адпаведна словамі «цягне» і «ад адной да трох»;

у абзацы першым часткі 9 словы «3 і 4» замяніць адпаведна лічбамі «3 — 5».

5. Артыкул 18.13 дапоўніць часткамі 5 — 8 наступнага зместу:

«5. Перавышэнне асобай, якая кіруе транспартным сродкам, устаноўленай хуткасці руху, зафіксаванае працуючымі ў аўтаматычным рэжыме спецыяльнымі тэхнічнымі сродкамі, якія маюць функцыі фота- і кіназдымкі, відэазапісу, ад дзесяці да дваццаці кіламетраў у гадзіну —

цягне накладанне штрафу ў памеры пяці дзясятых базавай велічыні.

6. Перавышэнне асобай, якая кіруе транспартным сродкам, устаноўленай хуткасці руху, зафіксаванае працуючымі ў аўтаматычным рэжыме спецыяльнымі тэхнічнымі сродкамі, якія маюць функцыі фота- і кіназдымкі, відэазапісу, ад дваццаці да трыццаці кіламетраў у гадзіну —

цягне накладанне штрафу ў памеры дзвюх базавых велічынь.

7. Перавышэнне асобай, якая кіруе транспартным сродкам, устаноўленай хуткасці руху, зафіксаванае спецыяльнымі тэхнічнымі сродкамі, якія працуюць у аўтаматычным рэжыме і маюць функцыі фота- і кіназдымкі, відэазапісу, ад трыццаці да сарака кіламетраў у гадзіну — цягне накладанне штрафу ў памеры чатырох базавых велічынь.

8. Перавышэнне асобай, якая кіруе транспартным сродкам, устаноўленай хуткасці руху, зафіксаванае спецыяльнымі тэхнічнымі сродкамі, якія працуюць у аўтаматычным рэжыме і маюць функцыі фота- і кіназдымкі, відэазапісу, ад сарака і больш кіламетраў у гадзіну —

цягне накладанне штрафу ў памеры шасці базавых велічынь.».

6. Артыкул 18.21 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«**Артыкул 18.21.** Невыкананне патрабавання аб прыпынку транспартнага сродку

1. Невыкананне асобай, якая кіруе транспартным сродкам, патрабавання супрацоўніка органаў унутраных спраў аб спыненні транспартнага сродку —

цягне накладанне штрафу ў памеры ад дзвюх да васьмі базавых велічынь.

2. Невыкананне асобай, якая кіруе транспартным сродкам, неаднаразовых патрабаванняў супрацоўніка органаў унутраных спраў аб спыненні транспартнага сродку —

цягне накладанне штрафу ў памеры ад трох да дзесяці базавых велічынь або пазбаўленне права кіравання транспартнымі сродкамі тэрмінам да шасці месяцаў.

3. Дзеянне, якое прадугледжана часткай 2 гэтага артыкула, што пацягнула пераследаванне такой асобы супрацоўнікамі органаў унутраных спраў, —

цягне накладанне штрафу ў памеры ад пяці да дваццаці базавых велічынь з пазбаўленнем права кіравання транспартнымі сродкамі тэрмінам да двух гадоў або без пазбаўлення.

Заўвага. 1. Патрабаванне супрацоўніка органаў унутраных спраў аб спыненні транспартнага сродку павінна адпавядаць правілам дарожнага руху.

2. Пад пераследаваннем у частцы 3 гэтага артыкула разумеецца пераследаванне супрацоўнікамі органаў унутраных спраў на транспартным сродку аператыўнага прызначэння з уключанымі праблісковымі сігналамі (маячкамі) сіняга або сіняга і чырвонага колераў асобы кіроўцы транспартнага сродку, які не выканаў заведама відавочныя для яго законныя неаднаразовыя патрабаванні супрацоўніка органаў унутраных спраў аб спыненні транспартнага сродку. Пры гэтым з выкарыстаннем спецыяльнага гукавога сігналу ажыццяўляецца інфармаванне ўдзельнікаў дарожнага руху аб неабходнасці павышэння ўважлівасці і выканання мер засцярогі.».

7. У артыкуле 18.22:

з абзаца першага часткі 3 словы «з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай больш за 3,5 тоны» выключыць;

дапоўніць артыкул часткамі 6 і 7 наступнага зместу:

«6. Прыпынак або стаянка транспартнага сродку з парушэннем правілаў дарожнага руху або неправамерная стаянка транспартнага сродку на месцы, адведзеным для стаянкі транспартных сродкаў інвалідаў, зафіксаваныя працуючымі ў аўтаматычным рэжыме спецыяльнымі тэхнічнымі сродкамі, якія маюць функцыі фота- і кіназдымкі, відэазапісу, —

цягнуць накладанне штрафу ў памеры адной базавай велічыні.

7. Прыпынак або стаянка грузавога аўтамабіля, аўтобуса, колавага трактара, самаходнай машыны, прычэпа з парушэннем правілаў дарожнага руху, зафіксаваныя працуючымі ў аўтаматычным рэжыме спецыяльнымі тэхнічнымі сродкамі, якія маюць функцыі фота- і кіназдымкі, відэазапісу, —

цягнуць накладанне штрафу ў памеры трох базавых велічынь.».

**Артыкул 2.** Унесці ў Працэсуальна-выканаўчы кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях ад 20 снежня 2006 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 14, 2/1291; 2010 г., № 300, 2/1750; Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 2013.07.27, 2/2062) наступныя змяненні і дапаўненні:

1. У частцы 5 артыкула 2.7:

словы «транспартнага сродку, зафіксаванай» замяніць словамі «, парушэнні правілаў прыпынку або стаянкі транспартнага сродку, зафіксаваных»;

словы «, або сродкамі фота- і кіназдымкі, відэазапісу» выключыць.

2. Частку 5 артыкула 6.12 пасля слова «руху» дапоўніць словамі «, парушэння правілаў прыпынку або стаянкі».

3. У частцы $2^1$ артыкула 8.9 словы «транспартнага сродку, зафіксаваным» замяніць словамі «, парушэнні правілаў прыпынку або стаянкі транспартнага сродку, зафіксаваных».

4. Часткі 2, 5 — 8 артыкула 8.10 выключыць.

5. У артыкуле 10.3:

у частцы $3^1$:

слова «выпадку» замяніць словам «выпадках»;

пасля слова «руху» дапоўніць частку словамі «, парушэнні правілаў прыпынку або стаянкі»;

з часткі $5^1$ словы «частак 1 — 3» выключыць.

**Артыкул 3.** Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 студзеня 2008 года «Аб дарожным руху» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 14, 2/1410) наступныя дапаўненні:

1. Дапоўніць Закон артыкулам $19^1$ наступнага зместу:

«**Артыкул $19^1$. Прымусовая адбуксіроўка (эвакуацыя) транспартнага сродку. Адбуксіроўка транспартнага сродку без змяншэння яго на ахоўную стаянку**

У выпадках, устаноўленых заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь, транспартны сродак можа быць прымусова адбуксіраваны (эвакуіраваны) і змешчаны на ахоўную стаянку.

Транспартны сродак можа быць адбуксіраваны без змяшчэння яго на ахоўную стаянку ў мэтах:

выканання задач, ускладзеных на органы дзяржаўнай бяспекі, у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь;

выканання задач, ускладзеных на орган дзяржаўнай аховы;

ліквідацыі перашкоды, створанай транспартным сродкам, руху, работа транспартных сродкаў аператыўнага прызначэння і (або) транспартных сродкаў дарожна-эксплуатацыйнай, камунальнай службаў пры адсутнасці іншай правамернай магчымасці выканання ўскладзеных на іх задач.

Прымусовая адбуксіроўка (эвакуацыя) транспартнага сродку, а таксама адбуксіроўка яго без змяшчэння на ахоўную стаянку пры наяўнасці ў гэтым транспартным сродку пасажыра (пасажыраў) забаронены.

Спагнанне платы з уласніка (уладальніка) за адбуксіроўку транспартнага сродку без змяшчэння яго на ахоўную стаянку ў выпадках, прадугледжаных часткай другой гэтага артыкула, не дапускаюцца.

Асоба, якая прыняла рашэнне аб прымусовай адбуксіроўцы (эвакуацыі) транспартнага сродку, аб адбуксіроўцы транспартнага сродку без змяшчэння яго на ахоўную стаянку ў адсутнасць кіроўцы, неадкладна інфармуе аператыўна-дзяжурную службу тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў па месцы знаходжання транспартнага сродку, якая неадкладна прымае захады па інфармаванні яго ўласніка (уладальніка) аб месцы знаходжання транспартнага сродку.

За пашкоджанні, нанесеныя транспартнаму сродку ў час яго прымусовай адбуксіроўкі (эвакуацыі), знаходжання транспартнага сродку на ахоўнай стаянцы, а таксама ў час яго адбуксіроўкі без змяшчэння на такую стаянку, нясуць адказнасць юрыдычныя асобы, работнікі якіх ажыццяўлялі прымусовую адбуксіроўку (эвакуацыю), захоўванне, адбуксіроўку транспартнага сродку без змяшчэння на ахоўную стаянку.

Змешчаны на ахоўную стаянку транспартны сродак вяртаецца ўласніку (уладальніку) або ўпаўнаважанай ім асобе па яго першым патрабаванні.

Парадак прымусовай адбуксіроўкі (эвакуацыі) транспартнага сродку, яго змяшчэнне на ахоўную стаянку, а таксама адбуксіроўкі транспартнага сродку без змяшчэння яго на такую стаянку, якая ажыццяўляецца ў выпадку, названым у абзацы чацвёртым частцы другой гэтага артыкула, вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Парадак адбуксіроўкі транспартнага сродку без змяшчэння яго на такую стаянку, якая ажыццяўляецца ў выпадку, названым у абзацы другім і трэцім частцы другой гэтага артыкула, вызначаецца сумесным нарматыўным прававым актам Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь і Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

Нарматыўныя прававыя акты, названыя ў частках восьмай і дзявятай гэтага артыкула, павінны змяшчаць пералік асоб, упаўнаважаных прымаць рашэнне аб прымусовай адбуксіроўцы (эвакуацыі) транспартнага сродку, аб адбуксіроўцы транспартнага сродку без змяшчэння яго на ахоўную стаянку, а таксама парадак фіксацыі знешняга стану транспартнага сродку, які падлягае прымусовай адбуксіроўцы (эвакуацыі), адбуксіроўцы без змяшчэння яго на ахоўную стаянку.».

2. У артыкуле 28:

пасля часткі трэцяй дапоўніць артыкул часткай наступнага зместу:

«Дакументам, які пацвярджае павышэнне кваліфікацыі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў (за выключэннем колавых трактароў), з'яўляецца пасведчанне, якое выдаецца па форме, зацверджанай Міністэрствам транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь.»;

часткі чацвёртую—сёмую лічыць адпаведна часткамі пятай—восьмай.

**Артыкул 4.** Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у трохмесячны тэрмін:

прывесці рашэнні ўрада Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Законам;

прыняць іншыя захады па рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона.

**Артыкул 5.** Гэты Закон уступае ў сілу ў наступным парадку:

пункт 4 артыкула 2, артыкул 3 — праз тры месяцы пасля афіцыйнага апублікавання гэтага Закона;

іншыя палажэнні — праз дзесяць дзён пасля афіцыйнага апублікавання гэтага Закона.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА**

*11 ліпеня 2014 года, г. Мінск.*
*№ 176—3*

## ■ Без бар'ераў

### ЭЛЕКТРОННЫ ДАВЕДНІК ДЛЯ ІНВАЛІДАЎ

**Студэнты Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы распрацавалі электронны даведнік для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Сервіс размешчаны па адрасе: http://nobarier.grsu.by/.**

Электронны даведнік уяўляе сабой базу даных арганізацый і прадпрыемстваў, размешчаных на тэрыторыі абласнога цэнтра, з указаннем элементаў безбар'ернага асяроддзя. Прадстаўлена каля 700 аб'ектаў аховы здароўя, гандлю, адукацыі, культуры, сацыяльнай абароны, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, банкаўскіх устаноў, а таксама аптэкі, аддзяленні сувязі, гасцініцы і іншыя будынкі гарадской інфраструктуры. Картка аб'екта характарызуе яго з пункту гледжання выканання асноўных патрабаванняў безбар'ернага асяроддзя. Альбо неадпаведнасці, згодна з дзяржаўным стандартам, усім неабходным пазіцыям у інтарэсах людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі. Напрыклад, які сэнс у пандусе для інвалідаў-калясачнікаў на ўваходзе ў будынак, калі там няма дзвярнога праёма неабходнай шырыні і ліфта? Альбо якая карысць ад аўтапарковачных месцаў для інвалідаў, калі ў аб'ект, што побач, ім немагчыма трапіць?

Такім чынам, электронны даведнік для інвалідаў — гэта не толькі карысная для іх інфармацыя, але і сродак кантролю за выкананнем неабходных работ па стварэнні безбар'ернага асяроддзя. Прапановы і пажаданні па гэтым даведніку можна накіроўваць на электронны адрас упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гродзенскага гарвыканкама: soczashita@mail.ru.

**Барыс ПРАКОПЧЫК** ■

## ■ Запрашальнік

### ВЫРАБЫ З ГАЗЕТЫ — НА ЗДЗІЎЛЕННЕ ЎСЯМУ СВЕТУ

**«Кніжка выйшла пагуляць» — пад такой назвай 31 ліпеня адбудзецца гарадское свята ў Беразіно.**

У ім прымуць удзел маладыя інваліды, якія наведваюць аддзяленне дзённага знаходжання Бярэзінскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. На свяце будзе прадстаўлена выстава іх работ «На здзіўленне ўсяму свету — вырабы з газеты»

Мерапрыемства ладзіцца ў рамках рэспубліканскай акцыі «Лета з добрай кніжкай».

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ** ■


Закрытое акционерное общество

**«Банк Инвестиционных Технологий»**

Юридический адрес: 220114, г. Минск, ул. Шемеша Адама, д. 28.

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2014 г.

Закрытое акционерное общество «Банк Инвестиционных Технологий»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2014 | 01.07.2013 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 2 949 | 3 854 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 9 047 | 25 147 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 70 302 | 191 998 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 73 416 | 64 743 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 119 592 | 30 730 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 5 369 | 3 784 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | - | - |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 13 038 | 2 627 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 293 713 | 322 883 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 17 | Средства банков | 1202 | 9 656 | 33 774 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 63 142 | 227 809 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | - | - |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 4 057 | 2 357 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 76 855 | 263 940 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 198 605 | 60 445 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 173 | - |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 41 | 7 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 18 039 | (1509) |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 216 858 | 58 943 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 293 713 | 322 883 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2014 г.

Закрытое акционерное общество «Банк Инвестиционных Технологий»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2014 | 01.07.2013 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 13 904 | 9 798 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 2 026 | 2 601 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 11 878 | 7 197 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 1 006 | 542 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 171 | 306 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 835 | 236 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 123 | 253 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 14 079 | 1 120 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 42 | 7 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 5 866 | 500 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 244 | 7 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 11 225 | 6 734 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 472 | 349 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 9 638 | 1 237 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 1 320 | 24 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 8 318 | 1 213 |

**Председатель Правления** **И.И. Гулевский**

**Главный бухгалтер** **Л.А. Болотина**

**Дата подписания «21» июля 2014 г.**

**http://bit-bank.by/ru/information-about-the-bank/22-financial-performance**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 33 от 07 июня 2013 года. УНП 807000242.



# РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже**

**здания административно-хозяйственного**
**с инв. № 500/С-10550,**
**принадлежащего ОАО «Оптоэлектронные системы» (Продавец) и расположенного по адресу: г. Минск, ул. Черняховского, д. 1.**

Часть здания с инв. № 500/С-10550 сдается в аренду: 19,3 м² по 31.05.2017; 21,8 м² по 31.12.2015; 23,4 м² по 31.12.2015; 28,3 м² по 31.12.2015; 63 м² по 31.12.2015; 19 м² по 31.12.2015; 79,9 м² по 31.05.2015; 31,3 м² по 31.12.2015; 58 м² по 31.12.2016; 80,6 м² по 31.05.2017; 30,1 м² по 30.04.2017; 38,7 м² по 31.12.2015; 10,1 м² по 31.01.2016; 22 м² по 31.05.2016.

Для эксплуатации и обслуживания здания административно-хозяйственного ОАО «Оптоэлектронные системы» предоставлен в аренду по 28.02.2015 земельный участок площадью 0,1226 га с кадастровым номером 500000000009005284 с ограничением прав на земельные участки, расположенные: в охранной зоне линий связи и радиофикации, площадь 0,0184 га; охранной зоне линий электропередачи, площадь 0,0055 га; охранной зоне сетей и сооружений газоснабжения, площадь 0,0040 га.

**Начальная цена с НДС – 7 920 960 000 бел. руб.**
**Задаток с НДС – 396 048 000 бел. руб.**

*Задаток перечисляется на р/с № 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.* Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества ОАО «Оптоэлектронные системы», проводимом 28 августа 2014 г.

Договор купли-продажи должен быть заключен в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Оплата за Объект осуществляется в срок, который будет установлен в договоре купли-продажи Объекта между Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом.

Аукцион состоится **28.08.2014 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.** Шаг аукциона – 5%. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 26.08.2014 до 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 2.**

*Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 12.02.2014.*

С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

☎ **Дополнительная информация: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: 5538325@mail.ru**



УНП 500833225

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ в объявление о проведении аукциона по продаже имущества ТУП «Гродненский автотранс № 9», назначенного на 20.08.2014 г., следующего содержания: исключить условие проведения аукциона.**
*Объявление было опубликовано в газете «Звязда» 19.07.2014 г.*



ПРАДАЕЦЦА
ўчастак у садовым таварыстве «Бярозаўка», Брэсцкі напрамак, 35 км ад МКАД, 10 сотак, фундамент. Тэлефон: 8-029-251-88-86.


## Минский районный исполнительный комитет 29 августа 2014 г. проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка | Целевое назначение | Инженерная инфраструктура * | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена земельного участка (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Боровлянский с/с, д. Чертяж, участок № 216 | 623680608601000237 | 0,1439 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество | - | 200 000 000 | 40 000 000 |
| 2 | Горанский с/с, аг. Чачково | 623681319101000515 | 0,1200 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, газ | 4 596 974 | 98 000 000 | 19 600 000 |
| 3 | Ждановичский с/с, д. Каменная Горка, ул. Цветочная, участок № 1 | 623681704601000156 | 0,1082 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, газ | 6 460 000 | 456 000 000 | 91 200 000 |
| 4 | Ждановичский с/с, аг. Ратомка, участок № 1 | 623681708601002914 | 0,1126 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | - | 7 290 000 | 217 000 000 | 43 400 000 |
| 5 | Ждановичский с/с, д. Тарасово, ул. Вишневая, 1 | 623681709601002068 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, газ, водопровод | 3 760 000 | 419 000 000 | 83 800 000 |
| 6 | г. Заславль, ул. Багряная, 5А | 623650100001004831 | 0,1028 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество, водопровод | 7 497 456 | 95 000 000 | 19 000 000 |
| 7 | Колодищанский с/с, аг. Колодищи, квартал 203, участок № 165Б | 623683403101007605 | 0,1403 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 6 477 605 | 127 000 000 | 25 400 000 |
| 8 | Колодищанский с/с, д. Юхновка, квартал 303 | 623683405101000753 | 0,1499 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, газ, водопровод | 7 162 000 | 218 000 000 | 43 600 000 |
| 9 | Крупицкий с/с, д. Закружка | 623683905101000128 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество | 5 881 526 | 83 000 000 | 16 600 000 |
| 10 | Лошанский с/с, д. Горошки | 623684002601000057 | 0,1039 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, водопровод | 4 968 385 | 70 000 000 | 14 000 000 |
| 11 | Михановичский с/с, д. Гребенка | 623684201601000060 | 0,1326 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество | 7 729 200 | 60 000 000 | 12 000 000 |
| 12 | Папернянский с/с, д. Селюты, участок № 7 | 623685509601000039 | 0,1013 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | - | 5 785 234 | 250 000 000 | 50 000 000 |
| 13 | Самохваловичский с/с, д. Валицковщина, участок № 4 | 623686301101000099 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | - | 6 642 080 | 95 000 000 | 19 000 000 |
| 14 | Хатежинский с/с, аг. Хатежино, участок № 145 | 623687508101001283 | 0.1500 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 4 273 772 | 200 000 000 | 40 000 000 |
| 15 | Шершунский с/с, д. Рогово | 623685817101000090 | 0,1221 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество | 7 626 000 | 22 000 000 | 4 400 000 |
| 16 | Щомыслицкий с/с, д. Заболотье, участок № 1 | 623688000001000836 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество | 8 652 623 | 207 000 000 | 41 400 000 |
| 17 | Юзуфовский с/с, д. Мацки | 623688206101000174 | 0,1296 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество | 6 468 200 | 31 000 000 | 6 200 000 |
| 18 | Юзуфовский с/с, д. Шепели | 623688208601000146 | 0,1339 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | электричество | 7 646 800 | 71 000 000 | 14 200 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **29.08.2014 г. в 10.00.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **25.08.2014 г. в 17.00.** Контактный телефон: 204-11-62.

Задаток за участие в аукционе на лот 1 перечисляется на расчетный счет № 3641900000163 Боровлянского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052345, код платежа – 04901.

На лот 2 перечисляется на расчетный счет № 3641900000150 Горанского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052360, код платежа – 04901.

На лоты 3–5 перечисляется на расчетный счет № 3641621030047 Ждановичского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052317, код платежа – 04901.

На лот 6 перечисляется на расчетный счет № 3641621200079 Заславского горисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600012999, код платежа – 04901.

На лоты 7–8 перечисляется на расчетный счет № 3641900000020 Колодищанского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052304, код платежа – 04901.

На лот 9 перечисляется на расчетный счет № 3641900000091 Крупицкого сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052399, код платежа – 04901.

На лот 10 перечисляется на расчетный счет № 3641900000046 Лошанского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600228670, код платежа – 04901.

На лот 11 перечисляется на расчетный счет № 3641900000105 Михановичского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600303747, код платежа – 04901.

На лот 12 перечисляется на расчетный счет № 3641621120061 Папернянского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052411, код платежа – 04901.

На лот 13 перечисляется на расчетный счет № 3641900000088 Самохваловичского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052424, код платежа – 04901.

На лот 14 перечисляется на расчетный счет № 3641900000121 Хатежинского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600231359, код платежа – 04901.

На лот 15 перечисляется на расчетный счет № 3641900000059 Шершунского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052358, код платежа – 04901.

На лот 16 перечисляется на расчетный счет № 3641000000076 Щомыслицкого сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052373, код платежа – 04901.

На лоты 17–18 перечисляется на расчетный счет № 3641900000147 Юзуфовского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052332, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

3. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет с отметкой банка.

4. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

4.1. представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион в отношении каждого земельного участка признается несостоявшимся в случаях, если: заявление об участии в аукционе подано только одним участником аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов); для участия в аукционе не было подано ни одного заявления; на аукцион явился один из участников или ни один из участников не явился на аукцион.

Аукцион в отношении каждого земельного участка признается нерезультативным в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона не предложил свою цену.

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Местный исполнительный комитет не позднее 2 рабочих дней после внесения победителем аукциона платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения и выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выдает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

Результаты аукциона аннулируются, если победитель аукциона в установленный срок: не внес плату за земельный участок; не возместил затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; не выполнил условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, а также иные условия участия в аукционе. При этом внесенный победителем аукциона задаток возврату не подлежит.

** В разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте.*

■ Абітурыент-2014

## СЯРОД ПЕРШАКУРСНІКАЎ БДУ МІНЧАНЕ СКЛАДАЮЦЬ ТОЛЬКІ ТРЭЦЮЮ ЧАСТКУ

Больш за палову залічаных па агульным конкурсе на дзённую бюджэтную форму навучання ў БДУ маюць сумарны бал сертыфікатаў і дакумента аб адукацыі 300 і больш. Гэта 804 чалавекі з 1489 залічаных па выніках здачы трох дысцыплін на цэнтралізаваным тэсціраванні. А ўсяго ў БДУ залічана на дзённую бюджэтную форму навучання сёлета 2050 чалавек.

Сярод будучых першакурснікаў БДУ — два лаўрэаты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і 127 пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд, 484 школьныя медалісты і ўладальнікі дыпломаў аб заканчэнні ССНУ з адзнакай, што складае 24% ад агульнай колькасці залічаных. І палову ад агульнай колькасці залічаных на першы курс складаюць выпускнікі гімназій і ліцэяў. Без экзаменаў, па рэкамендацыях навучальных устаноў, на педагагічныя спецыяльнасці былі залічаны 23 пераможцы абласных алімпіяд і школьныя медалісты.

Калі прааналізаваць геаграфію абітурыентаў БДУ, то яго студэнтамі сталі сёлета 737 мінчан (36% ад агульнай колькасці) і 147 жыхароў сельскай мясцовасці (7%). Астатнія першакурснікі прадстаўляюць розныя рэгіёны Беларусі.

**Сёлета ўзрасла папулярнасць прыродазнаўчых спецыяльнасцяў сярод дзяўчат: апошнія занялі 45% ад агульнай колькасці месцаў.**

Самыя высокія прахадныя балы сярод прыродазнаўчых спецыяльнасцяў былі зарэгістраваны на «Актуарнай матэматыцы» (370 балаў), «Геалогіі і разведцы радовішчаў карысных выкапняў» (351 бал) і «Прыкладной інфарматыцы» (напрамак — праграмнае забеспячэнне камп'ютарных сістэм) — 350.

Пры гэтым самы высокі сярэдні бал залічаных па агульным конкурсе на прыродазнаўчыя спецыяльнасці зафіксаваны на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі — 329 балаў. На другім радку размясціўся хімічны факультэт — 323 балы. А замыкае тройку біялагічны факультэт — 300 балаў. Факультэты радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій, механіка-матэматычны, геаграфічны і фізічны факультэты таксама прынялі добра падрыхтаваных абітурыентаў. Сярэднія балы залічаных на гэтыя факультэты — 276, 265, 245 і 236 балаў адпаведна.

У БДУ адзначаюць, што сёлета ўзрасла папулярнасць прыродазнаўчых спецыяльнасцяў сярод дзяўчат: апошнія занялі 45% ад агульнай колькасці месцаў.

На сацыяльна-гуманітарным і эканамічным напрамку лідарамі па прахадных балах сталі спецыяльнасці «Сусветная эканоміка» і «Бізнес-адміністраванне» — 371 бал, «Міжнароднае права» — 369 балаў і «Кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі» — 366. Для таго, каб паступіць на спецыяльнасць «Міжнародныя адносіны», трэба было набраць не менш як 364 балы, «Лагістыка» — 363 балы, «Менеджмент у сферы міжнароднага турызму» — 362, «Лінгвакраіназнаўства»— 361.

А ўзначаліў рэйтынг па сярэднім бале залічаных у БДУ Інстытут бізнесу і менеджменту тэхналогій, дзе сярэдні паказчык прынятых на «бюджэт» склаў 373 балы. Другое месца — у факультэта міжнародных адносін (369). У першую тройку трапіў таксама эканамічны факультэт — 345 балаў.

У Інстытуце журналістыкі на спецыяльнасці «Журналістыка» (аўдыявізуальная) прахадны бал склаў 365, «Журналістыка» (менеджмент сродкаў масавай інфармацыі) — 342 балы, «Журналістыка» (міжнародная) — 341 бал, «Журналістыка» (вэб-журналістыка) — 327 балаў, «Журналістыка» (друкаваныя СМІ) — 311 балаў. Сярэдні бал залічаных у Інстытут журналістыкі па агульным конкурсе — 355.

На завочную бюджэтную форму навучання БДУ прыняў 287 абітурыентаў. Самыя высокія прахадныя балы тут склаліся на філалагічным факультэце на спецыяльнасці «Руская філалогія» (269) і ў Інстытуце журналістыкі на спецыяльнасці «Журналістыка» (друкаваныя СМІ) — 225.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Побач з намі

# БАІМСЯ ЧАСТА БЕСПАДСТАЎНА

Пара зразумець, што чалавек з псіхічным захворваннем — не той, хто будзе бегаць па музеі і псаваць карціны

**Не так даўно ў Мінску адбыўся шакіруючы выпадак. Дзяўчына, якая пакутавала на шызафрэнію, жыла са сваёй мамай, і калі маці памерла, у дзяўчыны з-за моцнага стрэсу пачалося абвастрэнне захворвання. Спецыялісты кажуць, што абвастрэнні бываюць розныя. Гэтая дзяўчына ўпала ў ступар: сядзела на ложку і не варушылася. І ў выніку пражыла ў кватэры з трупам сваёй маці два тыдні, пакуль суседзі не забілі трывогу з-за непрыемнага паху. І не знайшлося нікога — ні чалавека, ні арганізацыі, хто б пацікавіўся, як у яе справы.**



— ...Хіба што псіханеўралагічны дыспансер раз на месяц абзваньвае сваіх хворых, якія знаходзяцца на ўліку, — кажа 38-гадовая Таццяна, якая жыве з шызафрэніяй ужо амаль 20 гадоў. Так, увесь гэты час яна на таблетках, і кожныя некалькі гадоў трапляе ў бальніцу на два месяцы. Але пры гэтым у Таццяны вышэйшая адукацыя — яна інжынер-эканаміст і да 2006 года працавала ў адной з навуковых арганізацый. З 2008 года атрымала групу інваліднасці, з тых часоў не працуе.

**Летась амбулаторную псіхіятрычную дапамогу атрымала 271 тысяча беларусаў (па звестках міжнароднага навукова-практычнага часопіса «Псіхіятрыя, псіхатэрапія і клінічная псіхалогія»).**

Калі шчыра, калі б я не ведала пра яе дыягназ, то ні пра што б і не здагадалася. Звычайная жанчына, спакойная, разважае разумна. Адзінае, што крыху кідаецца ў вочы, — пры размове яна зрушвае бровы, як быццам спрабуе больш засяродзіцца, але і толькі — можа сысці за бяскрыўдную звычку. Між тым Таццяна ўпэўнена, што чалавек назіральны можа выявіць, што яна хворая. І прыкметна, што думка аб гэтым ёй вельмі непрыемная.

— У мяне была праблема набыць штосьці ў краме. Я баялася людзей. Людзі са сферы абслугоўвання могуць зняважыць. Паводзяць сябе пагардліва... — кажа жанчына. — Калі прымаеш прэпараты, то можа быць млявасць. Аднойчы ў метро мяне прынялі за п'яную, а я проста была пад уздзеяннем лекаў...

У прынцыпе, я разумею, чаму Таццяна не хоча, каб навакольныя ведалі пра яе дыягназ: мала каго людзі адштурхоўваюць ад сябе так упарта, як псіхічна хворыя. Многія глядзяць на іх з асцярогай і падазрэннем, цураюцца або прынамсі адчуваюць сябе няёмка ў іх прысутнасці. Між тым, думаю, не памылюся, калі скажу, што на самой справе ў асяроддзі амаль кожнага чалавека ёсць людзі, якія пакутуюць на тое ці іншае псіхічнае расстройства, і большасць з нас нават не здагадваюцца пра гэта.

Дактары-псіхіятры кажуць, што сёння, дзякуючы стварэнню новых лекаў, многіх іх пацыентаў можна вярнуць у грамадства. Але ёсць адна праблема: дасягненні фармакалогіі апярэдзілі гатоўнасць грамадства да такога ходу падзей. Таму гэтыя людзі працягваюць адчуваць сябе ізгоямі і вельмі саромеюцца свайго захворвання. Да самага апошняга часу іх ніхто не падтрымліваў і ў сацыяльным плане, адно Міністэрства аховы здароўя рабіла тое, што магло, у межах сваёй кампетэнцыі...

### «А ДЗЕ Ж САМІ ХВОРЫЯ?»

Але калі Таццяна ляжала ў бальніцы два гады таму, псіхатэрапеўт ёй падказала, што ў Мінску адкрыўся клубны дом для такіх пацыентаў як яна. Таццяна стала яго наведваць. «Тут мы маем зносіны, па серадах у нас — камп'ютарныя курсы, па чацвяргах гатуем: тут ёсць мультыварка. Маецца доступ да інтэрнэту, можам паглядзець разам фільм...» — распавядае яна.

Больш за год сюды ходзіць і 37-гадовы Андрэй: «Тут усе на роўных, ніхто не тыкае пальцам, можна добра правесці час». Менавіта Андрэй сустрэў мяне на падыходзе: «Вы карэспандэнт? Хадземце, я вас праводжу». І гэта было вельмі дарэчы, таму што мне прыйшлося нямала паблукаць на ўскраіне Мінска, пакуль я знайшла неабходны будынак. А калі ішла за Андрэем, спрабавала зразумець: ён супрацоўнік або чалавек «з дыягназам»? Звычайны мужчына, хіба што вочы трохі сумныя... І толькі фраза «Вы позна, многія з нашых ужо пайшлі дадому» дазволіла зразумець, да якой катэгорыі яго залічыць.

Дырэктар клубнага дома «Адкрытая душа» Вольга Рыбчынская толькі ўсміхаецца: «Калі да нас прыходзілі валанцёры (было пару раз), дык яны пыталіся: а дзе ж самі хворыя? Мабыць, яны чакалі ўбачыць нешта з фільмаў жахаў, а тут усё спакойна, звычайныя размовы, чаяванні...».

Дарэчы, клубны дом — гэта мадэль рэабілітацыі людзей з псіхіятрычнымі дыягназамі, якую распрацавалі самі людзі з псіхічнымі захворваннямі. Гэта адбылося ў 1948 годзе ў ЗША. Спачатку гэта была група самадапамогі, потым туды запрасілі сацработнікаў. Цяпер у свеце каля 400 такіх клубных дамоў.

У Беларусі першы клубны дом «Адкрытая душа» адкрыўся ў 2011 годзе. Гэта быў сумесны праект Беларускай асацыяцыі сацыяльных работнікаў і саюзаў дабрачынных арганізацый Баварыі, клубнага дома «Ластаўчына гняздо» (Мюнхен) пры фінансавай падтрымцы фонду «Акцыя — чалавек» (Германія). Падтрымаў гэтую ідэю і РНПЦ псіхічнага здароўя.

— Цяпер мы працуем ужо без фінансавай падтрымкі нямецкага фонду — з гэтага года дзякуючы дзяржаўнаму сацыяльнаму заказу разлічваем на фінансавую дапамогу ад дзяржавы (ужо выйгралі тэндар), — кажа Вольга Рыбчынская.

Да гэтага для людзей, хворых на шызафрэнію, не існавала сацыяльных паслуг і рэабілітацыйных цэнтраў. Больш за тое, шызафрэнія з'яўляецца медыцынскім супрацьпаказаннем для таго, каб атрымліваць дапамогу з боку тэрытарыяльнага цэнтра сацабслугоўвання насельніцтва. Але ж такія людзі таксама маюць патрэбу ў дапамозе з боку грамадства!

Сёння ў клубе налічваецца каля 80 членаў: не толькі з Мінска, але і прыгарадаў, а таксама Лагойска і Барысава.

### ДРЫМУЧЫЯ СТЭРЭАТЫПЫ... АДУКАВАНЫХ ЛЮДЗЕЙ

— Мы працуем з людзьмі з шызафрэніяй, псіхозамі, псіхатычнымі расстройствамі і з людзьмі з расстройствамі настрою (сюды адносяцца дэпрэсія, біпалярнае расстройства), — кажа Вольга. — Мы разумеем асаблівасці такіх людзей, спакойна ставімся, калі прыходзіць чалавек ва ўзбуджаным стане, разумеем, што патрэбен час, каб ён асвоіўся ў нас.

— Працаваць з імі не так складана, як здаецца на першы погляд, — запэўнівае мяне сацработнік. — Сюды прыходзяць усё ж такі людзі з актыўнай жыццёвай пазіцыяй. Раз яны вырашылі не сядзець дома і прыйшлі да нас у клубны дом, значыць, настроены на пазітыўныя змены. Складаных сітуацый я і не ўзгадаю. Можа, часам хацелася б большай актыўнасці з іх боку, але мы разумеем, што многія прымаюць моцныя снатворныя. Таму не ўсе могуць прымусіць сябе прыйсці да нас к 9 раніцы. Гэта часам фізічна нерэальна пасля дозы таблетак.

Яшчэ адна асаблівасць: для таго, каб чалавек у нас адкрыўся і праявіў сябе, трэба, каб прайшло шмат часу, напрыклад, паўгода, год... Спачатку яны нічога не хочуць пра сябе распавядаць. Але пасля пацыху, бачачы, што ўсе навокал настроены прыязна, пацыху раскрываюцца. Потым людзі пачынаюць сустракацца адно з адным ужо і за межамі клубнага дома, завязваюцца сяброўскія стасункі...

Мы ўсе разам ходзім на выставы, у музеі, тэатры. Хоць аднойчы быў абуральны выпадак. Неяк мы збіраліся наведаць адзін з музеяў. Папярэдне патэлефанавалі, сказалі, што хацела б прыйсці група людзей з інваліднасцю. У нас спыталі, з-за чаго інваліднасць, і мы адказалі, што з-за псіхічнага захворвання. Супрацоўніца музея была вельмі здзіўлена і заявіла, што яны не хочуць бачыць у сябе ў музеі членаў нашага клубнага дома. А мы былі ў шоку, даведаўшыся, якое ў яе ўяўленне пра такіх людзей і чаго яна чакае ад іх! Наяўнасць такіх дрымучых стэрэатыпаў было асабліва дзіўна назіраць у адукаванага чалавека з сферы культуры. Даўно пара зразумець, што чалавек з псіхічным захворваннем — не той, хто будзе бегаць па музеі і псаваць карціны, — з горыччу заўважыла Вольга Рыбчынская.

❍ ❍ ❍

Сапраўды, стэрэатыпаў у дачыненні да гэтых людзей усё яшчэ шмат. Так, некаторыя лічаць, што людзі з псіхічнымі захворваннямі маюць нізкі інтэлект, прасцей кажучы, дурні, — распавядае Вольга. — І адпаведна ставяцца да іх. Але інтэлект і псіхічнае захворванне звычайна ніяк не звязаны паміж сабой. Сярод такіх людзей, як і сярод здаровых, ёсць больш разумныя і менш.

І ўзровень агрэсіўнасці ў такіх людзей такі ж, як і сярод здаровых. І калі выпадкі агрэсіўнасці ўсё ж бываюць, то гэта, як правіла, не таму, што чалавек з псіхічным захворваннем агрэсіўны, а таму, што на яго няправільна рэагуюць і ён пачынае абараняцца. І часцяком абараняецца мацней, чым таго патрабуе сітуацыя, таму што ён і так «на мяжы».

Дарэчы, спецыялістамі даказана, што самую сур'ёзную небяспеку ў грамадстве ўяўляе малады псіхічна здаровы беспрацоўны мужчына ва ўзросце ад 18 да 25 гадоў, асабліва калі ён знаходзіцца пад уплывам алкаголю або наркотыкаў. Псіхічна хворыя (калі выключыць хворых на алкагалізм і наркаманію) здзяйсняюць менш за 2% з усіх гвалтоўных злачынстваў.

**P.S.** *Калі ішла праца над гэтым артыкулам, мы даведаліся, што з мінулага года ў Мінску працуе яшчэ адна ўстанова для людзей з псіхічнымі захворваннямі — Цэнтр «Адкрыты дом», створаны Беларускім таварыствам Чырвонага Крыжа пры падтрымцы Чырвонага Крыжа Ісландыі.*

**Святлана БУСЬКО**

■ Спорт-тайм

## ЛУЧНІКІ ЗАВАЁЎВАЮЦЬ УЗНАГАРОДЫ

**Матчы кубка краіны па футболе, паражэнне хакейнага «Дынама» і сярэбраная ўзнагарода беларуса на кантынентальным чэмпіянаце па стральбе з лука. «Звязда» падводзіць вынікі спартыўных падзей, якія адбыліся на гэтых выхадных.**

**1. Хакейнае «Дынама», якое рыхтуецца да чарговага сезона ў кантынентальнай хакейнай лізе, саступіла ў першым спарынгу ў падрыхтоўцы да чэмпіянату.** На «Мінск-Арэне» сталічная лядовая дружына саступіла піцерскаму СКА 0:3. Вынік, безумоўна, не самы лепшы, але гэта толькі першы матч у міжсезонні. «Я не магу паскардзіцца на адсутнасць настрою ў нашых хлопцаў, — рэзюмаваў паядынак **Любамір ПОКАВІЧ, галоўны трэнер «Дынама».** — Хіба што крыху «падселі» пасля другой шайбы. Так, свісток суддзі прагучаў, але мы вучым гульцоў, каб яны абвастралі абстаноўку да апошняга. Але гэта, безумоўна, не апраўданне. Сапернікі выкарысталі свае шанцы, а мы — не». Нагадаем, што «зубры» выйшлі з адпачынку 11 ліпеня, а ў нядзелю адправіліся на двухтыднёвыя зборы ў чэшскае мястэчка Краварж. За гэты час мінчане мусяць правесці тры трэніровачныя матчы: з браціслаўскім «Слованам», тршынецкім «Оцэларжы» і «Аламоўцам».

**2.** Пераходзім ад хакея да айчыннага футбола. **На выхадных адбыліся паядынкі 1/16 кубка краіны.** Не абышлося і без сенсацый. Першалігавая «Гарадзея» па пенальці (5:4) перамагла жодзінскі «Тарпеда-БелАЗ», а «Зорка-БДУ» была мацнейшай за «Мінск» (1:0). Астатнія матчы прынеслі наступныя вынікі: «Ліда» — «Слуцк» — 0:1, «Хімік» (Светлагорск) — «Гомель» — 1:2, «Баранавічы» — «Дынама» (Брэст) — 1:2, «Хваля» (Пінск) — «Іслач (Мінскі раён) — 2:4, «Ждановічы» (Мінскі раён) — «Нафтан» (Наваполацк) — 0:4, «Гомельчыгунтранс» — «Славія» (Мазыр) — 2:1, «Смаргонь» — «Дняпро» (Магілёў) — 0:2, ФСК «Гродзенскі» — «Белшына» (Бабруйск) — 1:4, «Граніт» (Мікашэвічы) — «Рэчыца-2014» — 1:0, «Партызан-2002» (Мінск) — «Віцебск» — 1:3.

**3. Беларускі лучнік Антон Прылепаў заваяваў сярэбраныя ўзнагароды на чэмпіянаце Еўропы, які прайшоў у армянскім Эчміядзіне.** У фінальным паядынку беларус саступіў нямецкаму спартсмену Фларыяну Кахлунду. Акрамя таго, Антон паклаў у сваю скарбонку яшчэ і бронзавую ўзнагароду. Трэцяе месца ў змешаных спаборніцтвах ён заняў разам з Аленай Толкач.

**4. Хутчэй за ўсё, у новым сезоне за жаночую зборную Беларусі па біятлоне будзе выступаць расіянка Ульяна Дзянісава.** Яна ўжо паспела прайсці збор з нашай камандай і трэнерамі цяпер засталося прыняць канчатковае рашэнне.

**5. Вікторыя Азаранка па-ранейшаму займае 10-ы радок у Жаночай тэніснай асацыяцыі.** У абноўленым спісе лідзіруе Серэна Уільямс, на другім месцы знаходзіцца кітаянка Лі На, а на трэцім радку — румынка Сімона Халеп.

**Тарас ШЧЫРЫ**

■ Сезонная праблема



## ВЫ НЕ АДНЫ Ў ХМЫЗНЯКУ

**Кляшчы могуць сустракацца паўсюль, дзе багата расліннасці — у лесе, парку, скверы. Асабліва ў непраходным гушчары, дзе шмат нізкарослага хмызняку. Паколькі кляшчы могуць быць крыніцай барэліёзу, лепш за ўсё пазбягаць сустрэчы з гэтымі насякомымі. Група інфекцыйных захворванняў, якія выклікаюць барэліі (іксодавыя клешчавыя барэліёзы), праяўляецца пашкоджаннем скуры, нервовай сістэмы, апорна-рухальнага апарату і сэрца, засцерагае ўчастковы тэрапеўт 11-й гарадской палiклінікі г. Мінска Таццяна ПАРХОМЕНКА.**

Часцей за ўсё кляшчы мацуюцца да адзення ў лесе, заносяцца з букетамі кветак, дровамі і на целе жывёл (сабак). Можна заразіцца лаймбарэліёзам і падчас ужывання негатаванага (пераважна казінага) малака. Хвароба Лайма ў большасці выпадкаў праяўляецца паступова. На месцы пранікнення кляшча ўзнікае макула або папула, якая праз некалькі дзён ператвараецца ў пачырваненне дыяметрам ад 3 да 70 см. Яно можа смылець ці паколваць. Разам з гэтым хворы можа адзначаць павялічаныя лімфавузлы, слабасць, боль у мышцах, суставах, гарачку (да 37-39 градусаў), галаўны боль, млосць, ваніты. Назіраецца пашкоджанне нервовай сістэмы (амаль да расстройстваў свядомасці, эпілепсіі, інфаркту мозга; пакутуюць таксама сэрца, суставы, печань, вочы).

Чым раней пачаць антыбактэрыяльнае лячэнне, тым большая верагоднасць спыніць захворванне яшчэ ў першасным скураным ачагу. Абавязкова звярніцеся да ўрача пры першых падазрэннях.

**Святлана БАРЫСЕНКА**




### НЕАПЛАЧАНЫ ДОЎГ

Было гэта ў 90-я гады мінулага стагоддзя. Тады, як вядома, быў Саюз, і ўсе яго 15 рэспублік жылі дружна — сябравалі паміж сабой, супрацоўнічалі.

Вось і наш саўгас аж у Казахстан прадаваў племянных цялушак, а там купляў камбікармы.

І так мы імі затарыліся: забілі ну ўсе склады, усе гаражы! А вось разлічыцца...

Зрабіць гэта дамаўляліся па бартары — апроч цялушак, абяцалі «паставіць» у Казахстан ільняныя мяшкі. І, вядома ж, «паставілі» б, каб маглі. Але ж не было тады грошай! А потым усё пахіснулася, разваліўся Саюз. З таго Казахстана нам працягвалі званіць...

Адтуль жа неяк раз прыходзіць тэлефанаграма: нашага дырэктара выклікаюць у аблвыканкам (усе дагаворы заключаліся на ўзроўні кіраўнікоў гаспадарак, але ж з ведама раённага ды абласнога начальства). Па якім пытанні той, напэўна, здагадваўся, бо сам не паехаў — адправіў мяне.

Я тады працавала галоўным заатэхнікам, думала, што еду (як-ніяк за дырэктара!) на нейкую нараду па жывёлагадоўлі. А таму на ўсялякі выпадак ўзяла ў бухгалтэрыі лічбы, прыкінула выступленне (раптам слова дадуць?). Прыязджаю.

Мяне тут жа запрашаюць да намесніка старшыні па жывёлагадоўлі. Ён рукі за спіну залажыў, па кабінеце ходзіць і абураецца: як гэта можна, маўляў, кармы ўзяць, а грошы не заплаціць?.. Непрыстойна як, непрыгожа, сорамна!

Я і сама гэта ведаю... А што магу зрабіць? Сяджу, маўчу.

Потым той намеснік вядзе мяне да старшыні, там, бачу — цэлая дэлегацыя — з Казахстана. І ўсё пачынаецца па новай.

Я зноў маўчу, бо што казаць — не я ж кіраўнік гаспадаркі. Тут адзін з гасцей не вытрымлівае, кажа:

— Усё, бяром гэту дзяўчыну ў заклад: аддасць дырэктар пазыку — аддамо і мы...

Я ў адказ:

— Цікавая прапанова! Але ж нічога з яе не выйдзе! Бо ў нас не адзін заатэхнік... Так што саўгас абыдзецца — не будзе мяне выкупляць... А мне, можа, у вас спадабаецца, дык і застануся.

Госці тады доўга смяяліся. Але яшчэ даўжэй мы кармілі скаціну іх камбікормам. Факт, што мяшкі ў Казахстан так і не адправілі...

**Соф'я КУРЦІН,**

*г.п. Лынтупы, Пастаўскі р-н.*

### САШКА І ГУСАК

У сем гадоў я пайшла ў школу, а напярэдадні праходзіла медыцынскі агляд. Цётачка ў белым халаце змерала мой рост, вагу, праверыла горла, вушы, а потым, загадаўшы прыкрыць далонню адно вока, стала пытаць:

— Якая гэта літара? — і тыцнула ўказкай у табліцу.

— Баранка! — упэўнена адказала я.

— Правільна, — усміхнулася лекарка і пераглянулася з маёй мамай.

— А гэта якая?

— Загагулька!

— Малайчына! Памяняем вока... Ну, а гэта?..

— Граблі!

— Цудоўна! — зарагатала лекарка.— Здароўе ў парадку. Можна ісці ў школу і вучыць літары.

Так я стала вучаніцай.

Першы дзень у школе мне запомніўся дзвюма падзеямі: у нашым класе аказалася дзяўчынка з чароўным, нечуваным дагэтуль імем — Роза. А другое — я нарэшце ўбачыла Гусака.

Наогул, прозвішча ў чалавека было Лебедзь, і ў школе ён працаваў... дырэктарам, але мае брат, сястра і ўсе суседскія дзеці звалі яго толькі Гусак. (Гэта ўжо потым, шмат гадоў пасля, калі сталі дарослымі, мы зразумелі, што наш дырэктар быў зусім не благі, проста вельмі патрабавальны. Тады ж, у маленстве, мы яго баяліся і не надта любілі).

А гісторыя з ім выйшла такая. Мой брат быў страшэнным гарэзам. І вось за нейкія яго правіны нашых бацькоў выклікалі ў школу. А як ім пайсці, калі яны абое на працы цэлы дзень?

Карацей, у кабінет да Лебедзя пайшла наша старэнькая бабулька. Сядзіць там, бедная, слухае, што ўнук яе дужа непаслухмяны, хуліганіць, што нічога людскага з яго не вырасце, і ад страху ажно калоціцца, галавою ківае ды прыгаворвае:

— Добра, таварыш Гусак... Бацька з ім разбярэцца, таварыш Гусак... Не хвалюйцеся, таварыш...

Дырэктар строга кашлянуў і прамовіў:

— Прабачце, але маё прозвішча не Гусак, а Лебедзь!

Тут наша бабуля перапужалася яшчэ болей:

— Ды што вы кажаце?!.. Ай-яй-яй! А наш Сашка ўсё: Гусак ды Гусак, Гусак ды Гусак! Ну, пачакай, паршывец!..

Адным словам, уляцела Сашку ад бацькі — і за свавольствы, і за Гусака!

Думаеце, зрабіў высновы? Ні ў якім разе!

Аднойчы ў школе нам далі заданне запісаць у сшытак пяць прыказак пра свойскіх птушак і жывёл. Я чатыры прыказкі ўспомніла, а вось пятую...

Падыходзіць брат і з хітрынкамі ў вачах гаворыць:

— Пішы, я прыгадаў: «Не быць ніколі шэраму гусаку белым лебедзем».

Варухнулася ў маёй душы нейкае падазрэнне, але думаць не хацелася. Я запісала гэтую прыказку ў сшытак — ды гуляць...

Праз дзень раздае настаўніца сшыткі і раптам пытае ў мяне:

— Томачка, а адкуль, з якой кніжкі ты выпісала прыказку пра гусака і лебедзя?

— Ды ні адкуль — мне брат яе падказаў.

— А, ну тады зразумела!..

Пашанцавала Сашку, што настаўніца наша была добрая і разумная, а то дасталося б яму яшчэ раз.

**Тамара БУНТО,**

*г. Мінск.*

### ЁСЦЬ ЛОГІКА!

...Спачатку анекдот. На стале дзве кнігі ляжаць. Першая з іх старонак на 250-300. Называецца «Логіка». Побач — фаліянт старонак на 600: «Жаночая логіка. Том першы». Вось пра яе, пра жаночую логіку, і пойдзе гаворка.

Значыць, сяджу я неяк раз у сваім кабінеце. Выдалася вольная хвілінка — баўлю яе з гумарыстычнай газетай «15 сутак». Заходзіць супрацоўніца.

— Што чытаеце? — пытаецца ў мяне.

— Ды во (паказваю) свежы нумар газеты прыйшоў. І ведаеш, іншы раз тут цікавыя афарызмы друкуюцца. Ну вось як табе гэты: «Мужчынам небяспечна наступаць на граблі. На дзіцячыя грабелькі — удвая»?

Рэакцыя каляжанкі на гэту фразу была імгненнай і такой, што я нават разгубіўся:

— Ой, дзякуй, што нагадалі, — сказала жанчына. — Мне ж трэба яек сёння купіць.

Жаночая логіка, праўда?

**Анатоль ПАЛЫНСКІ,**

*г. Беразіно.*

### ВОСЬ І ЎСЯ ЛЮБОЎ

...Ах, якія цяпер вяселлі! Зборы, салоны, рэстараны, картэжы, шыкоўныя строі, прычоскі, макіяжы, букеты... І ўсё гэта — прычым тут жа — у інтэрнэт. Нават вясельныя падарожжы, нават інтым! А што — хай людзі бачаць. Ніякіх таямніц...

Дык вось. Знаёмыя кабеты наглядзеліся неяк на чужыя вяселлі — надзівіліся, напляваліся ды сталі ўспамінаць свае. Цётка Маня апошняй «слова ўзяла». Сказала:

— Ат, дзеўкі, так, як у мяне, ні ў кога з вас не было!..

І ўжо потым, цяжанька ўздыхнуўшы, дадала:

— Вы ж ведаеце — Косцік мой сімпатычны быў, на ўсе рукі майстар... Вось і ўтрэскалася. Ведама — дурніца, дзіця, толькі васямнаццаць стукнула. Бацькі па вечарах яшчэ з хаты не заўсёды выпускалі — у клуб, на сяло, а мы ўжо з ім пажаніцца сабраліся. Ён неяк вечарам кажа:

— Заўтра я жыта буду жаць пад Альхоўцамі, дык ты прыйдзі. Я адлучуся — сходзім у сельсавет распішамся.

Не ведаю, як тую ноч пераначыла — раніцою збіраюся... Надоечы новую сукенку сама пашыла. А як адзець? Бацькам жа сказала, што ў грыбы іду. Злажыла абнову ў клунак, схавала ў кошык, выйшла з хаты — сэрца з грудзей...

Шчасце, што дарога праз лес — не бачыць ніхто, сустрэчных няма — можна і подбегам, бо хвалююся ж, бо спяшаюся — баюся спазніцца!

У мігі даляцела: паблізу ўжо тая вёска, ды і поле павінна... Але камбайна чамусьці не чуваць. Цешуся, дурніца: гэта ж мой Косцік зачакаўся ўжо, матор заглушыў, усе вочы прагледзеў...

Ага!.. Як жа! Падышла бліжэй, бачу — ён пад камбайнам ляжыць.

Я давай яго клікаць:

— Косцік, каток, я прыйшла...

А ён, бачу, вухам не вядзе — корпаецца там у нечым.

— ...Ты ж клікаў, казаў мы распішамся?

Ён тады з-пад камбайна (мурзаты — з галавы да ног, а ўжо злосны...) — і ў наступ: якія, маўляў, тут роспісы, якая жаніцьба?! Не бачыш — у мяне камбайн паламаўся! Каменне гэта чортава!..

Я, вядома ж, у крыўду, у слёзы...

Толькі тады ён крыху пацішэў, прытуліў мяне, прылашчыў... Ён гэта ўмеў!.. А потым і кажа:

— Ну добра, сёння не атрымалася ў нас, тады заўтра прыходзь. Можа, камбайн не зломіцца...

Кахала я дужа, таму і прыйшла. Схадзілі мы ў сельсавет, распісаліся. Вось і ўсё.

**Любоў ЧЫГРЫНАВА,**

*в. Забалацце, Вілейскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

## НА ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ — 500 Л САМАГОНКІ!

**Лепшы падарунак — той, які зроблены сваімі рукамі. Мабыць, так разважаў мінчанін, які падрыхтаваў да свайго дня нараджэння 500 л самагонкі.**

Вартавым парадку паступіла інфармацыя аб тым, што ў адным з прыватных дамоў на вуліцы Малой захоўваецца спіртазмяшчальная прадукцыя. Туды для праверкі прыбылі супрацоўнікі аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі РУУС. На месцы знайшлі дзве бочкі самагонкі па 250 л кожная. Гаспадар жылля заявіў, што так падрыхтаваўся спраўляць свой дзень нараджэння. Аднак міліцыянеры яму не паверылі — самагонку канфіскавалі і знішчылі. А гаспадару дома цяпер прыйдзецца заплаціць штраф 1,5 млн рублёў. Яшчэ 650 л самагоннай брагі выявілі ў закінутым доме на вуліцы Пятроўшчына.

**«Мінск — Навіны».**

■ Наш фармат

## 3 МІЛЬЯРДЫ ЗА 3 ГАДЫ

**3 мільярды беларускіх рублёў — такую планку ахвяраванняў перасягнуў нядаўна дабрачынны інтэрнэт-аўкцыён сустрэч «МаеСэнс».**

Заснаваны напрыканцы 2011 года беларускімі студэнтамі-праграмістамі Дзянісам Кандратовічам і Міхасём Карпіцкім, сацыяльны інтэрнэт-праект прадставіў новы і вельмі дзейсны падыход да дабрачыннасці. Маладыя людзі (а на сайце www.maesens.by зарэгістравана ўжо больш як 60 тысяч чалавек з розных куткоў краіны) выстаўляюць на аўкцыён у якасці лота... саміх сябе — свой час, веды, захапленні і цікавы вопыт, якім яны гатовы абмяняцца з іншымі. Ахвотна далучаюцца да праекта і вядомыя персоны — свае кандыдатуры для эксклюзіўных сустрэч прапаноўвалі артысты Аляксандр Саладуха і Ларыса Грыбалёва, музычныя гурты «Без білета» і «Топлес», алімпійская віцэ-чэмпіёнка Аляксандра Герасіменя, тэлевядучыя Дзяніс Кур'ян і Алесь Мухін, бізнесмены Юрый Зісер, Аляксандр Кныровіч і многія іншыя. Такім чынам у скарбонку ўдзельнікаў праекта трапляюць новыя знаёмствы, а на дабрачынныя рахункі — грашовыя сродкі, якія штомесяц ідуць на дапамогу дзіцячым дамам, сацыяльным прытулкам, дабрачынным фондам і арганізацыям, медыцынскім установам і канкрэтным дзецям, якія маюць патрэбу ў аператыўным лячэнні і рэабілітацыі, і г.д. Пры тым кожны карыстальнік, які ініцыюе сустрэчу, сам можа выбіраць, на які адрас пойдуць грошы ад яго «продажу».

Дзякуючы такому крэатыўнаму падыходу інтэрнэт-аўкцыён сустрэч «МаеСэнс» пералічыў на дабрачыннасць ужо больш як 3 мільярды беларускіх рублёў. І гэта, запэўніваюць стваральнікі праекта, далёка не мяжа: «Падтрымка іншых людзей у цяжкія часы — гэта самае важнае. Але мы можам яшчэ больш і не будзем спыняцца, бо гэта сапраўды мае сэнс!».

**Вікторыя ЗАХАРАВА**

Ігуменскі тракт
№ 25 (83)

■ Брэнд краіны

# РАМАНТЫЧНАЕ ВЯСЕЛЛЕ Ў ДОМЕ ПАНА МІЦКЕВІЧА

**Дом-музей Адама Міцкевіча ў Навагрудку — гэта не звычайны музей, як можа здацца на першы погляд, з экспазіцыяй і зашклёнымі вітрынамі. Гэта сапраўды той самы дом, у якім жылі калісьці бацькі паэта і ён сам. І нават цяпер, праз два стагоддзі, будынак захоўвае атмасферу жылых памяшканняў той далёкай эпохі.**

Трапіўшы ўсярэдзіну, адразу разумееш, што тут усё сапраўднае: вось старадаўнія ходзікі кожныя паўгадзіны сваім ціхім звонам адмерваюць час, а вось над лесвіцай, ля самага акна, утульна прымасціліся два вялізныя крэслы і столік — усеўшыся ў іх, так зручна весці спакойную прыватную размову. Прайшоўшы прасторную вітальню, адразу трапляеш у дзіцячы пакой, затым у кабінет бацькі і гасцёўню — усё расплянавана для зручнага сямейнага жыцця. Далей ідуць былая сталовая, у якой сёння паказана тэма знаходжання Міцкевіча ў Расіі, і былая спальня, дзе апавядаецца пра эміграцыю паэта.

**Дырэктар Дома-музея Адама Міцкевіча Мікалай ГАЙБА** адзначае, што сам будынак, з калонамі, старадаўнім дахам, добраўпарадкаванай навакольнай тэрыторыяй добра відаць з вуліцы, і сваім знешнім выглядам ён часта прываблівае нават выпадковых наведвальнікаў:

— Прыемна бачыць, як мясцовыя хлопцы, дзяўчаты прыходзяць сюды са сваімі каханымі, якія прыехалі з іншых гарадоў, рамантычна трымаючыся за рукі. Значыць, яны лічаць, што ў нас можна добра правесці час і адкрыць для сябе штосьці новае. Дарэчы, рашэннем райвыканкама дом-музей Адама Міцкевіча афіцыйна зарэгістраваны як месца, дзе можна правесці ўрачыстую цырымонію заключэння шлюбу. У альтанцы, што стаіць на нашай тэрыторыі, і дарожках вакол яе спецыяльна афармляецца пляцоўка для ўрачыстасці. Маладым, якія прыходзяць да нас, мы заўсёды кажам: «Ваша ўступленне ў шлюб адбываецца ў доме сям'і, якая дала свету вялікага паэта. Менавіта тут ён рабіў першыя ў сваім жыцці крокі. Няхай і ваша сям'я будзе такой жа моцнай, і калі не паэт вырасце ў ёй, то нехта іншы, хто паўплывае на лёс многіх людзей».

## «ПАЭТЫ НАРАДЖАЮЦЦА Ў КАРЧМЕ»

Аднак, калі быць да канца шчырым, то Адам Міцкевіч нарадзіўся ўсё ж не тут. Атрымалася так, што бацькі паэта, якія здымалі кватэру ў Навагрудку, вырашылі на каталіцкія Каляды з'ездзіць да старэйшага з роду, у яго ўладанні ў Завоссі. А гэта ў 45-ці кіламетрах на поўдзень ад Навагрудка (цяпер Баранавіцкі раён, дзе знаходзіцца сядзіба-музей паэта). Менавіта там 24 снежня 1798 года нарадзіўся Адам. Праз паўтара месяца, калі дзіця падужэла, Міцкевічы вярнуліся дадому і 12 лютага ахрысцілі малога ў навагрудскім фарным касцёле.

Ёсць і іншая версія, згодна з якой Міцкевіч нарадзіўся не ў самім Завоссі, а за два кіламетры ад яго, у прыдарожнай карчме. Дарэчы, карчмой у той час называлі не проста шынок, але і пастаялы двор, на якім можна было спыніцца, дзе меліся неабходныя ўмовы для адпачынку. Менавіта пра такое нараджэнне пісаў у сваім вершы, прысвечаным Міцкевічу, Рыгор Барадулін: «Паэты нараджаюцца ў карчме, каб іх пасля аплаквалі саборы».

Мікалай Гайба, рэзюмуючы абедзве версіі, усё ж падкрэслівае, што Адама Міцкевіча можна лічыць навагрудчанінам ад нараджэння:

— Нават калі сёння па збегу абставін дзіця нараджаецца ў цягніку ці самалёце, то ў якасці месца нараджэння ўсё адно запішуць тое, дзе зарэгістраваны бацькі. Міцкевічы жылі ў Навагрудку, з'ездзілі ў падарожжа, там нарадзілася дзіця, вярнуліся і зноў былі ў гэтым горадзе. Але калі разважаць пра гэтую падзею больш паэтычна, «касмічна», то можна сказаць, што ўпершыню расплюшчыў вочы і ўбачыў зорнае неба, месяц будучы вялікі паэт у засценку Завоссе.

**Дом-музей афіцыйна зарэгістраваны як месца, дзе можна правесці ўрачыстую цырымонію заключэння шлюбу.**



Мікалай ГАЙБА ведае амаль усё пра жыццё Адама Міцкевіча.





Гадзіннік з віленскага пакоя паэта.

## АДЗІН З НАЙПРЫГАЖЭЙШЫХ У НАВАГРУДКУ

Праз год пасля нараджэння Адама памёр уладальнік Завосся, яно перайшло ў спадчыну да бацькі Міцкевіча. Яны пэўны час пажылі там, а пасля прадалі сваякам. Самі ж у 1806-1807-х гадах пабудавалі цагляны дом — той самы, у якім цяпер размяшчаецца музей. Па сведчанні Ігната Дамейкі, ён быў адным з найпрыгажэйшых у Навагрудку. Бо на той час толькі цэрквы і касцёлы былі мураванымі, а прыватных забудоў з каменю рабілі вельмі мала.

Каб пабудаваць гэты дом, бацька паэта пазычыў грошы ў аптэкара. Калі хлопчыку ішоў 13-ы год, бацька памёр. Таму наступныя шэсць гадоў маці разам з Адамам і іншымі яго братамі давялося жыць у флігелі. Свой вялікі дом яны здавалі кватарантам, каб мець сродкі на жыццё і аддаваць пазыку аптэкару.

Скончыўшы 6-класную навагрудскую дамініканскую школу, Адам Міцкевіч паступіў у Віленскі ўніверсітэт. Адвучыўшыся там чатыры гады, яшчэ на шэсць гадоў ён па размеркаванні быў накіраваны настаўнікам у Коўна. Там яго арыштавалі за ўдзел у таварыстве філаматаў і выслалі у Расію. Апошні раз у Навагрудак ён прыязджаў ва ўзросце 22-х гадоў, ужо пасля смерці маці.

Дом давялося прадаць на публічных таргах, і 100 гадоў у ім жылі чужыя людзі (да 1938-га — часу адкрыцця музея). Аднак усе ведалі, што ў гэтым доме раней жыў паэт. Пацвярджаюць гэта шматлікія публікацыі вандроўнікаў сярэдзіны XIX стагоддзя, якія праязджалі праз Навагрудак і пісалі, што тут ёсць такая памятка, як дом, у якім жыў Адам Міцкевіч.

## ЦЕНІ-ПРЫВІДЫ НА СЦЯНЕ

У 1881 годзе ў ліку іншых дзесяці гэты дом згарэў. Новы гаспадар Дамброўскі адбудаваў яго і пачаў здаваць у арэнду. З таго часу тут жылі пераважна маршалкі паветовай шляхты. У 1938 годзе ў адбудаваным і крыху змененым доме быў адкрыты музей.

У 1941-м дом-музей разбурылі, аднак Навагрудскім саветам дэпутатаў у 1948 годзе было прынята рашэнне аднавіць яго, пра што расказвае Мікалай Гайба:

— Уявіце, як шмат тады было спраў па аднаўленні разбуранай гаспадаркі. Аднак усё адно вырашылі рабіць дом Міцкевіча, шукаць грошы на гэтую справу. Паралельна збіраць музейныя прадметы. За 1955-м у музейным архіве пазначана паступленне мэблі (столік, крэслы) з Туганавіч — месца, дзе калісьці жыла каханая паэта Марыля Верашчака. Тады ж сюды быў перададзены гадзіннік з віленскага пакоя паэта. У той час у людзей яшчэ захоўваліся старыя рэчы, хтосьці пераязджаў з дома ў кватэру і тое, што не мог забраць з сабой, прапаноўваў музею. Мэтанакіравана шукалі прадметы і нашы музейныя супрацоўнікі.

У 1990-1991-х гадах сядзіба зноў была рэканструявана і набыла свой сучасны выгляд.

Варта дадаць, што асноўны будынак і флігель, у якім сёння размяшчаецца музычна-літаратурны салон, злучае падземны ход. У падвале дома знаходзіцца кухня з печчу, тагачаснымі сталовымі прыборамі. Калі ўключыць невялікую лямпу, на сцяне з'яўляюцца цені-прывіды былых жыхароў дома, што сабраліся за сталом. Блукаючы па сутарэннях, можна бачыць шматлікія карціны, якія вісяць на сценах, — бо гэта не проста сутарэнні, а галерэя...

Таму, хто трапіў у гэты дом, адразу адкрываецца невядомы раней, таямнічы і прывабны свет Адама Міцкевіча. За адзін дзень цалкам вывучыць яго немагчыма. Можна толькі распачаць для сябе шлях спазнавання нашага вялікага паэта.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*Навагрудскі раён.*



■ Абрысы радзімы

# ГІСТАРЫЧНЫ НАВІГАТАР: «Вялікае Княства Літоўскае на старажытных геаграфічных мапах»

...Старажытны картограф Фра Маўро моцна рызыкаваў. Ён ствараў сваю «Планісферу», разумеючы, што выкліча абурэнне ў тых, хто цэнтрам свету бачыў Іерусалім, ад якога ішлі іншыя землі. Ён, манах ордэна камальдулаў з манастыра святога Міхала, што ў Венецыянскай рэспубліцы, вымушаны быў апраўдвацца перад царквой. Тагачаснае ўяўленне пра свет і мысленне людзей было падпарадкавана хрысціянскім каштоўнасцям: галоўнае месца на зямлі — тое, дзе жыў Ісус. І можна верыць у Ісуса, разумець, чаму горад яго ўваскрэсення ставілі на карце ў цэнтр Сусвету, але пры гэтым імкнуцца да праўды геаграфічнай. І можна было паважаць папярэдніка Пталемея з яго «Касмаграфіяй», картамі якога, дарэчы, кіраваўся Калумб падчас падарожжа ў Індыю, але разумець: свет значна больш цікавы, і варта ўдакладняць веды пра яго. Сам Фра Маўро стаў асобай таямнічай, якая да таго ж пакінула на сваёй карце свету 1450 года шмат загадак, якія дагэтуль застаюцца нерасшыфраванымі.

Але яго імкненне да дакладнасці нас можа ўсцешыць: «Планісфера» — першая з вядомых картаў, дзе былі пазначаны землі, на якіх сёння жывём мы. Землі Вялікага Княства Літоўскага на карце адлюстраваны даволі падрабязна і вобразна. Аўтар нанёс не толькі асноўныя водатранспартныя артэрыі краіны, такія як Дзвіна, Нёман, Дняпро і г.д., але і некаторыя дарогі, што злучалі гарады і правінцыі княства. Апроч буйных гарадоў, такіх як Полацк, Смаленск, Віцебск, Гародня, на карту нанесены і зусім не значныя населеныя пункты. Тут мы таксама сустракаем суіснаванне антычных і сучасных тапонімаў як у назвах рэк, так і земляў. З аднаго боку, мы чытаем на карце пра еўрапейскую Сарматыю, Чорную Русь, Чырвоную Русь, якія літаральна суседнічаюць з тапонімамі Літва, а крыху ніжэй знаходзім Белую Русь. Праўда, ужо паводле «Карты мора» Олафа Магнуса мы можам скарэктаваць разуменне таго, што за землі называліся ў той час «Белай Руссю»...

Такія карты (калі дакладна, то іх копіі), якія паказваюць бачанне нашай тэрыторыі ў розныя гістарычныя эпохі сусветнымі і айчыннымі картографамі, сабраны на выставе «Візуальныя вобразы гістарычнай памяці, альбо Вялікае Княства Літоўскае на старажытных геаграфічных мапах», якая праходзіць у Мінску ў арт-прасторы «Цэх».

— Старажытныя геаграфічныя карты ўяўляюць сабой унікальныя гістарычныя артэфакты. У іх, як і на карцінах вялікіх мастакоў альбо ў архітэктурных шэдэўрах, мы бачым матэрыяльны злепак мінулага, спынены час, — адзначае адзін з арганізатараў, кнігавыдавец Эдуард Куфцерын. — Сваімі рукамі сярэднявечныя картографы і мастакі стварылі для нас не проста геаграфічныя карты, але своеасаблівыя парталы для перамяшчэння, візуальную машыну часу, якая пераносіць нас у эфемернае мінулае, якое бадай бясследна знікае.

Што сапраўды цікава: ёсць магчымасць прасачыць уяўленне пра землі, на якіх мы сёння жывём, у кантэксце сусветнай і еўрапейскай картаграфіі, у разглядзе перыяду ўладна Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Чатыры тэматычныя блокі, кожны з якіх удакладняе іншыя. А ў спалучэнні — нараджае вобразы далёкай мінуўшчыны.

**Мы чытаем на карце пра еўрапейскую Сарматыю, Чорную Русь, Чырвоную Русь, якія літаральна суседнічаюць з тапонімамі Літва, а крыху ніжэй знаходзім Белую Русь.**

Мы бачым эвалюцыю сусветнай картаграфіі ад таго моманту, калі яна была больш фантастычнай, вобразнай, давала хутчэй уяўленне пра свет, чым яго рэальныя абрысы. І тады складальнікі картаў выступалі асветнікамі альбо нават літаратарамі: чаго толькі вартая Эбстарфская карта, якая хутчэй падобна да сярэднявечнай энцыклапедыі, на якой, апроч геаграфічных аб'ектаў, змешчана больш за 1600 легенд: апісанні вятроў, прыроды, славутасцяў, раслінная і жывёльная свету, падзеі царкоўнай і антычнай гісторыі. Вось яшчэ цікава пабачыць «Новую мапу ўсіх земляў свету» 1689 года, складзеную галандцам Герардам ван Шагенам. Дакладна быў чалавек з багатымі ведамі і ўяўленнем на той час, які шчыра дзяліўся з іншымі: увесре, пад зорным небасхілам з накрэсленымі на ім знакамі сузор'яў, — пейзаж, які ўвасабляе Алімп, дзе бог Зеўс пануе над зямнымі істотамі ў сяброўстве з іншымі багамі, ударамі стыхій. Аўтар кампазіцыйна і сімвалічна заключыў «зямную кулю» ў прастору трох стыхій — Зямлі, Неба і Мора...

Ці вось яшчэ цікавы вобраз: карта Еўропы 1598 года паказвае наш кантынент у выглядзе жаночай фігуры. Нездарма за ёй замацавалася назва «Каралева Еўропа». Дык на гэтай карце тэрыторыя тагачаснай Літвы бачыцца часткай цела Еўропы. Карта, безумоўна, алегарычная, нават для таго часу. Таму што яшчэ ў 1544 годзе фламандскі картограф і географ Герард Меркатар выдаў карту Еўропы, дзе былі выпраўлены памылкі, што паўтараліся ў картаграфіі яшчэ з часоў Пталемея. Меркатар лічыцца адным з пачынальнікаў сучаснай картаграфіі. Але нам ён асабліва цікавы тым, што ў 1595 годзе стварыў карту, арыгінальная назва якой у перакладзе з лацінскай мовы гучыць як «Літва». Яго праца лічыцца першай геаграфічнай выявай Вялікага Княства Літоўскага (альбо найстаражытнейшай картай Беларусі). Таксама гэтая карта сведчыць пра тое, што нават пасля Люблінскай уніі 1569 года, якая паклала пачатак адзінай федэратыўнай дзяржаве, вядомай як Рэч Паспалітая, у Еўропе Літву ўспрымалі як самастойную дзяржаву, што знаходзіцца ў саюзе з Каралеўствам Польскім.

— Гэтая выстава дае панараму, ілюструе, як ад фантастычнай картаграфіі рабіўся пераход да выяў, якія імкнуліся да дасканаласці, — адзначыў навуковы рэдактар Алег Дзярновіч. — Наогул, для нас картаграфія XVII — XVIII стагоддзяў важная, бо мы бачым, як акрэсліваюцца ўсходнія, паўднёвыя, часткова заходнія межы нашага краю. Але асабліва адметная ў гэтым сэнсе так званая «Радзівілаўская карта».

Яе поўная назва — «Вялікае Княства Літоўскае і іншыя суседнія рэгіёны з іх дакладным апісаннем». Аўтары — Тамаш Макоўскі і Гэсэль Герытс — стварылі яе па замове князя Мікалая Хрыстафора Радзівіла па мянушцы Сіротка. Надрукавана карта была на яго сродкі ў Амстэрдаме ў 1613 годзе вядомым выдаўцом Вілемам Блаў. Арыгінал гэтай карты захоўваецца ва ўніверсітэцкай бібліятэцы шведскага горада Упсала. Але ў нас ёсць магчымасць паглядзець і ўявіць, якой бачылі сваю краіну буйныя магнаты і палітыкі таго часу Радзівілы.

Менавіта дзякуючы Мікалаю Радзівілу практычна адразу пасля стварэння ім у 1586 годзе Нясвіжскай ардынацыі і атрымання князскага тытулу пачаліся нябачныя да яго па маштабе тапаграфічныя і гідраграфічныя даследаванні на землях ВКЛ. Вынікам стала вельмі падрабязная і максімальна дакладная на той час карта ВКЛ. Не дзіва, што Радзівілаўская карта лічыцца адной з лепшых у Еўропе ў XVII стагоддзі.

**Радзівілаўская карта лічыцца адной з лепшых у Еўропе ў XVII стагоддзі.**

Цікава, што вялікі патрыёт Вялікага Княства Літоўскага Мікалай Радзівіл абазначыў на карце дзве мяжы ВКЛ — да Люблінскай уніі 1569 года і пасля яе. Мноства надпісаў на ёй распавядаюць пра розныя гістарычныя падзеі, асаблівасці мясцовасці, звычаі народа і г.д. Напрыклад, з апісання Падлесся (Палессе) мы даведваемся, што яго жыхары сушылі рыбу на ветры і гандлявалі ёю ў іншых землях. У другім надпісе аўтары карты нібыта просяць прабачэння перад гледачамі за недакладнасць абазначэння прамежкаў у некаторых абласцях з-за балоцістай мясцовасці, што не дазваляла зрабіць дакладны прамер...

Недакладнасці на картах — яшчэ адзін цікавы момант для разважанняў. Аўтар прыгожай карты «Еўропа, новае апісанне Вілема Блаў» (1650 года) паказаў на ёй ВКЛ, якое прасціраецца ад мора да мора і паўстае своеасаблівым усходнім фарпостам Еўропы, які аддзяляе яе ад Азіі. Вось дык памылка — і ад таго самага чалавека, які меў дачыненне да выдання дакладнай Радзівілаўскай карты!.. Мо таму і «вярнуў» ВКЛ страчаныя паўднёвыя землі, што ведаў аб прэтэнзіях на іх буйных магнатаў, таго ж Мікалая Радзівіла Сіроткі, які заказваў у яго карту. Картограф — таксама чалавек, які мае свае прыхільнасці і асабістыя адносіны. Хоць дакладнасць на той час ужо была важнай. Дакладнасць, дарэчы, дапамагае нам зразумець па картах часоў Рэчы Паспалітай, напрыклад, 1799 года, балючы перыяд падзелу краіны.

Існаванне краін, іх межы ў пэўныя гістарычныя перыяды, змены абрысаў — тое, пра што сведчаць карты. І тое, што дае ўяўленне пра гістарычны працэс, які прывёў да нашых сучасных межаў. Чаму ўсё было так, з якіх прычын? Пра гэта таксама ёсць падставы разважаць, агледзеўшы выставу копій сусветных значных і знакавых картаў.

...Мы бяром у рукі карту, калі трэба зарыентавацца, зразумець, дзе знаходзішся, каб вызначыцца, куды рухацца далей. Нездарма выстава будзе суправаджацца іншымі мерапрыемствамі і дыскусіямі, адна з якіх пазначана так: «Дзе ў свеце плыве Беларусь?»

**Ларыса ЦІМОШЫК**




Карта «Каралева Еўропа».

■ Выстава

# ПАХ ЖЫЦЦЯ І СМЕРЦІ

**Рэчы ўтрымліваюць дух гаспадароў. Нават калі гаспадароў даўно няма — яны альбо загінулі, альбо памерлі ад старасці ці ран і панеслі з сабой памяць пра тое, як праз смерць адных выратоўваецца жыццё іншых. Рэчы пра гэта распавядаюць.**

Рэчы маюць пах. Яны маюць пах гаспадароў. Гэта пах жыцця і смерці гаспадароў. Выстава ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь мае пах жыцця і смерці. Яны ідуць заўсёды поруч, нават у мірны час, калі ведаюць дакладна момант свайго ўладарства над чалавекам. Але ў ваенны час яны змагаюцца за ўладарства. Выстава, якая вядзе да гэтай думкі, называецца «Рэчы паміж жыццём і смерцю». Яна паказвае прадметы, якія звычайна бяруць на вайну салдаты, не важна, якой яны арміі і з якога народа. Усе салдаты (вайскоўцы, ваяры, змагары) маюць нейкія дробныя рэчы, якія зручна пакласці ў кішэню, карыстацца імі ў «палявых» умовах. Гэта рэчы жыцця, нават на вайне, дзе патыхае смерцю.

Гэтую выставу падрыхтаваў Музей Арміі ў Стакгольме разам з калекцыянерам Турб'ёрнам Ленскугам, які сабраў і прадаставіў для паказу ўсе экспанаты. Дзіўнае захапленне — можна падумаць спачатку. Але ж, калі ўглядзецца і падумаць, то галоўнае ў гэтай выставе — гэта захапленне жыццём, якое ідзе і мае свае правы нават падчас вайны: захапленне чалавекам і вера ў яго; разуменне, наколькі крохкім можа быць мір і чаму за яго трэба чапляцца, нават калі гэта «дрэнны мір». Але вайна — заўсёды забойства, прычым масавае. Вось толькі чалавечая маса складаецца з мноства жывых асобных адзінак, кожная з якіх мае свае мары, пачуцці, планы, захапленні, мае блізкіх, каханых, без думак пра якіх не ідзе ў бой. І гэта тое, што родніць людзей (а для некага — узброеных людзей), якія знаходзяцца па розныя бакі лініі фронту. І гэта — самая галоўная глеба для міру, бо кожны салдат хоча вярнуцца дадому.

Нездарма выстава пра рэчы, якія літаральна вярнуліся з вайны, была прызнана ў Швецыі самай эстэтычнай у 2010 годзе, калі яе прэзентавалі. Яна эстэтычная таму, што насамрэч няма нічога больш прыгожага, чым жыццё і ўсё, што з ім звязвае і пра яго нагадвае. Паўсядзённыя праявы жыцця падчас вайны — гэта старыя фотаздымкі, якія, напэўна, насілі ля сэрца салдаты, гэта лыжкі, ігральныя карты, лекі, прылады для галення, нават «паходныя» музычныя інструменты. Таму што салдат падчас вайны, калі ёсць хвілінка, гатуе ежу, мыецца, курыць, нешта спявае, жартуе, сумуе... Любы салдат, любой арміі: немец, рускі, амерыканец, японец...

Гэты міжнародны праект, прэзентацыя якога арганізавана Нацыянальным гістарычным музеем Беларусі, працягнецца ў нашай краіне год; яго маюць на мэце паказаць у розных гарадах. Дагэтуль выстава экспанавалася ў Гродне, пасля Мінска паедзе ў Гомель, Магілёў і Брэст. Яе ўжо пабачылі жыхары шмат якіх краін Еўропы. І хоць нам у Беларусі не трэба тлумачыць, што значыць быць паміж жыццём і смерцю падчас вайны, але можна адчуць гэты момант чыста з чалавечага пункту гледжання: праз дробныя, але цёплыя рэчы — таму што іх трымалі, імі карысталіся жывыя. Усё-такі, гэтыя рэчы ўтрымліваюць пах жыцця.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

# СЯБРУЮЦЬ З «ЛЕЦЕЙКАМ» МАЙСТРЫ



Дэманстрацыя дзявочага адзення, якое школьнікі пашылі адпаведна рэгіянальнаму строю.



Так на традыцыі упрыгожваюць велікодныя яйкі.

**«Лецейка» — так назвалі сваё аб'яднанне юныя аматары народных рамёстваў, якія жывуць у аграгарадку Гомель Полацкага раёна. Іх узорны фальклорны калектыў створаны пры мясцовай дзіцячай школе мастацтваў. Дзятва пераймае ў старэйшых аднавяскоўцаў сакрэты лазапляцення, вышывання, інкрустацыі, разьбы па дрэве, выканання народных песень і бытавых танцаў.**

Майстры з «Лецейка» сёлета паспяхова выступілі на рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня». Яны прадэманстравалі ўзоры адзення, пашытага імі і ўпрыгожанага паводле мясцовых традыцый. Паказалі, якія хатнія прылады, цацкі, абярэгі з дрэва, травы, бяросты рабілі вяскоўцы ў мінулыя часы.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**
**Фота аўтара.**



У руках вучаніцы Машы СЕНІКАВАЙ лялька, сплеценая з асакі.

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении 20 августа 2014 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего МО ОАО «Луч» – управляющей компании холдинга «Обувь – «Луч»

| | |
|---|---|
| Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе) | **Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-3379 общей площадью 1030 кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Немига, 30/1 (наименование: Здание клуба. Литер К 2/к; назначение: здание неустановленного назначения)** |
| Продавец имущества | МО ОАО «Луч» – управляющая компания холдинга «Обувь – «Луч», ул. Короля, 2, АБК, каб. 415, 220004, г. Минск |
| Организатор торгов | УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| Начальная цена предмета торгов (без учета НДС) | 29 926 770 000 белорусских рублей |
| Сумма задатка | 2 900 000 000 белорусских рублей |
| Условия торгов (условия продажи) | 1. Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение повторного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. 2. При приобретении предмета торгов (продаваемое имущество) покупатель обязуется на протяжении одного месяца подписать охранное обязательство в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» |
| Наличие обременений | аренда |

Продаваемое имущество является историко-культурной ценностью.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего МО ОАО «Луч» – управляющей компании холдинга «Обувь – «Луч», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся **20 августа 2014 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 30.07.2014 по 18.08.2014 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»); (017)200-12-65, 226-59-70 (МО ОАО «Луч» – управляющая компания холдинга «Обувь – «Луч»).**

---

Ликвидатор объявляет о продаже имущества ОДО «Белармахим» (УНП 190150053) в виде

## грузового бортового тентового автомобиля MERCEDES-BENZ 1733, 1990 г.в., дизель.

**Начальная цена – 80 000 000 бел. руб. без учета НДС 20%.**
Торги проводятся впервые.
**Торги в виде аукциона состоятся 29 августа 2014 г. в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1118-10** (по месту нахождения организатора торгов).
Ознакомиться с предметом торгов можно по месту его нахождения, предварительно согласовав дату и время с организатором торгов.

Шаг аукциона – 5 процентов. **Продавец – ОДО «Белармахим»** (тел.: (017) 268-54-52; вел. (029) 613-61-32). **Организатор торгов – ООО «Партнер-Консультант»** (220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1118-10, тел.: (017) 268-54-52; вел. (029) 613-61-32).

*Прием заявок начинается с момента выхода объявления, осуществляется по месту нахождения организатора торгов и прекращается за три дня до начала торгов. Задаток вносится до подачи заявления на участие в торгах в размере 10 процентов начальной цены предмета торгов (без НДС) на р/с 3012028033009 в ЗАО «БелСвиссБанк» РКЦ 10, г. Минск, код 175, УНП 190771625, получатель – ООО «Партнер-Консультант», назначение платежа: задаток за предмет торгов.*

При признании торгов несостоявшимися в связи с наличием заявления на участие в них только от одного участника, возможна продажа предмета торгов этому участнику по цене, увеличенной на 5 процентов.

К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16. Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях в течение 5 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме с учетом НДС 20% не позднее 5 рабочих дней с даты подписания договора купли-продажи.

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Аукцион состоится 29.08.2014 в 10.00**
**по адресу: 220030, г. Минск, просп. Независимости, 11/1, 2 этаж, конференц-зал.**
**Организатором аукциона является**

## республиканское унитарное предприятие «Отель «Минск»,

**находящееся по адресу: г. Минск, просп. Независимости, 11.**
На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:

1. Помещение №117а, арендуемой площадью 3,8 кв.м, на первом этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 1-7 (литер А 6/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 96 900 рублей; размер задатка – 9 650 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 306 000 рублей.

2. Помещение № 423, арендуемой площадью 21,8 кв.м, на четвёртом этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 555 900 рублей; размер задатка – 55 550 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 306 000 рублей.

**Документы на участие в аукционе принимаются с 29.07.2014 по 27.08.2014 с 8.30 до 12.00, с 13.00 до 16.00, по адресу: г. Минск, просп. Независимости, 11/2, каб. 232. Документы, поданные после 16.00 27.08.2014, не рассматриваются.**

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 «О мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 07 мая 2009 № 238».

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:

*- перечисляет задаток на р/с №3012000006014 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП 100973184, ОКПО 37372251, РУП «Отель «Минск»;*

*- подает заявление на участие в аукционе;*

*- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;*

*- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.*

Помимо указанных документов:

***- физическое лицо** предъявляет документ, удостоверяющий личность;*

***- индивидуальный предприниматель** – копию свидетельства о государственной регистрации;*

***- юридическое лицо** (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, в заявлении сообщает о нахождении на территории Республики Беларусь представительства с указанием даты выдачи Министерством иностранных дел Республики Беларусь разрешения на открытие представительства, номера и срока действия разрешения.*

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

**Порядок оформления участия в аукционе:** лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

*При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.*

**Порядок определения победителя аукциона:**

- торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

- аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

**Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и(или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством, составляет 10 000 000 рублей.**

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участником документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Телефоны для справок: (8-017) 209-91-26, (8-017) 209-92-78.**

---

*«Банк, основанный на доверии»*
**ЗАО «Трастбанк»**
220035, г. Минск, ул. Игнатенко, 11

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
## на 1 июля 2014 года

Наименование банка: ЗАО «Трастбанк»
(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 25216 | 23630 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 364 | 414 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 195641 | 180870 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 30317 | 90507 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | - | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 323288 | 314373 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 2364 | 2364 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 159129 | 115549 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 4108 | 47270 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 51858 | 47702 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 792285 | 822679 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | 47265 | 46675 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 19769 | 47902 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 461687 | 474291 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 38770 | 55526 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 10980 | 10228 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 578471 | 634622 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 97787 | 85417 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 20195 | 10212 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 91188 | 86674 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 4644 | 5754 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 213814 | 188057 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 792285 | 822679 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
## за январь–июнь 2014 года

Наименование банка: ЗАО «Трастбанк»
(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 32454 | 29210 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 21568 | 23496 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 10886 | 5714 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 15964 | 21489 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 1623 | 1841 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 14341 | 19648 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 57 | 46 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 1013 | 887 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 1420 | 2444 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (4) | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 3159 | 2456 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 43050 | 8230 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 65423 | 30708 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 1755 | 2362 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 426 | 1443 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 115 | 22 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 311 | 1421 |

**Председатель Правления ЗАО «Трастбанк» В.М.Саксон**

**Главный бухгалтер Н.В.Бродик**

**Дата подписания «21» июля 2014 г.**

**Финансовая отчетность в полном объеме размещена на сайте http://www.trustbank.by/about/financial-statements/quarter/2014/**

УНП 100789114. Лиц. № 14 от 26.04.2013 г. НБ РБ

---

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | - Капитальное строение, инв. № 420/С-4164 (назначение – здание административно-хозяйственное, примечание – административное здание), общей площадью – 165,4 кв.м, г. Лида, ул. Калинина, 45.<br>- Капитальное строение, инв. № 420/С-45379 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание диспетчерской), г. Лида, ул. Калинина, корп. 1, общей площадью – 92,6 кв. м.<br>- Капитальное строение, инв. № 420/С-44466 (назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – здание заправочной), г. Лида, ул. Калинина, 45, корп. 7, общей площадью – 20,1 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 420/С-44469 (назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – здание калориферной), г. Лида, ул. Калинина, 45, корп. 5, общей площадью – 12,4 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 420/С-4168 (назначение – здание специализированное транспорта, примечание – двухэтажное панельное здание гаража № 2), г. Лида, ул. Калинина, 45, общей площадью – 1141,5 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 420/С-4163 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), г. Лида, ул. Калинина, 45, общей площадью – 345,3 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 420/С-4165 (назначение – здание нежилое, примечание – здание агрегатное, топливное отделение, электроцех, котельная), г. Лида, ул. Калинина, 45, общей площадью – 641,7 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 420/С-47232 (назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – насосная), г. Лида, ул.Калинина, 45, корп. 6, общей площадью – 18,6 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 420/С-4166 (назначение – здание нежилое, примечание – трансформаторная подстанция), г. Лида, ул. Калинина, 45, общей площадью – 19,6 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 420/С-47234 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство), г. Лида, ул. Калинина, сооружение благоустройства производственной территории ОАО «ГродноАТЭП», общей площадью – 12628,0 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 420/С-46844 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть), г. Лида, ул. Калинина, водопроводная сеть на производственной территории ОАО «ГродноАТЭП», протяженностью – 128,3 м.<br>- Капитальное строение, инв. № 420/С-46843 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), г. Лида, ул. Калинина, канализационная сеть на производственной территории ОАО «ГродноАТЭП», протяженностью – 121,59 м.<br>- Капитальное строение, инв. № 420/С-50292 (назначение – сооружение специализированное транспорта, наименование – крановая эстакада), г. Лида, ул. Калинина, крановая эстакада на производственной территории ОАО «ГродноАТЭП», общей площадью – 0,0 кв.м.<br>- зеленые насаждения, г. Лида, ул. Калинина, 45.<br>- электрическая сеть. |
| **Местонахождение объекта** | г. Лида, ул. Калинина, 45. |
| **Лот расположен на земельном участке** | Кадастровый номер 423650100013001252, площадью 1,8513 га (назначение – земельный участок для обслуживания производственной территории) по адресу: г. Лида, ул. Калинина, 45. |
| **Примечания** | Имеются ограничения со стороны 3-х лиц в виде аренды. |
| **Начальная цена продажи** | 4 157 303 040 (четыре миллиарда сто пятьдесят семь миллионов триста три тысячи сорок) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 207 865 152 (двести семь миллионов восемьсот шестьдесят пять тысяч сто пятьдесят два) белорусских рубля |
| **Продавец** | ОАО «ГродноАТЭП», 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 109, тел. 520234 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225. |

**Аукцион состоится 12 августа 2014 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 24.06.2014 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30.**

**Последний день приема заявлений – 6 августа 2014 г. до 15.00.**

**Тел. для справок: 41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

---

В **суд Кобринского района Брестской области** поступило заявление о признании безвестно отсутствующим КОЛЯДИЧА Сергея Николаевича, 19.10.1970 года рождения, уроженца д. Демидовщина Кобринского района, последнее известное место жительства: д. Демидовщина Кобринского района.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам сообщить имеющиеся сведения о Колядиче Сергее Николаевиче в течение 2-х месяцев с момента публикации.

---

## ОАО «Гомельхлебопродукт»

**извещает своих акционеров о проведении внеочередного общего собрания акционеров ОАО «Гомельхлебопродукт» 12 августа 2014 года.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**
**1. О распределении прибыли Общества и выплате дивидендов за 2013 год.**

Собрание состоится по адресу: г. Гомель, ул. Мазурова, 48, актовый зал ОАО «Гомельхлебопродукт». Начало в 14.00.

С проектом решения собрания акционеры могут ознакомиться по адресу: г. Гомель, ул. Мазурова, 48, тел. (8 0232) 72 59 40.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

УНП 400010980 *Наблюдательный совет ОАО «Гомельхлебопродукт».*

---

## УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

### извещает о проведении 29 августа 2014 г. аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды имущества, в рамках 157-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности

| № предмета аукциона | Местонахождение имущества | Площадь (кв.м) | Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы | Начальная цена права заключения договора аренды имущества (руб.) | Целевое использование имущества | Сумма задатка (руб.) | Характеристика имущества |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Арендодатель – Филиал «ЖКК» ОАО «Стройтрест № 4»,** *тел. +375(17)280 26 96* | | | | | | | |
| 79 | г. Минск, ул. П. Бровки, 32 | 9,92 | 3,0 | 252 960 | Под административные цели (офис) | 25 200 | Помещение на 2 этаже двухэтажного административно-хозяйственного здания. Имеются естественное освещение, отопление. Санузел и вход совместно с другими арендаторами. |
| **Арендодатель – Республиканское унитарное предприятие «Белорусский институт строительного проектирования»,** *тел.: +375(17) 226 42 12, +375(17)285 33 48* | | | | | | | |
| 94 | г. Минск, ул. Смоленская, 15 | 53,9 | 3,0 | 1 374 450 | Под административные цели (офис) | 137 400 | Помещения №№ 16, 16а, 16б, 16в, 16г. Кабинет на 10-м этаже здания. Имеются естественное освещение, отопление, электроснабжение. Санузел и вход совместно с другими арендаторами. Имущество предоставляется в аренду сроком на 1 год. |
| 95 | г. Минск, ул. Смоленская, 15 | 55,0 | 3,0 | 1 402 500 | Под административные цели (офис) | 140 200 | Помещения №№ 26, 26а, 26б. Кабинет на 10-м этаже здания. Имеются естественное освещение, отопление, электроснабжение. Санузел и вход совместно с другими арендаторами. Имущество предоставляется в аренду сроком на 1 год. |

**Договор аренды по предмету аукциона № 79 заключается сроком на 5 лет; по предметам аукциона №№ 94 и 95 – на 1 год.**

**Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10.**

Аукцион состоится **29 августа 2014 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Возможность **осмотра Имущества**, право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион, **обеспечивает арендодатель**. Организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнять у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), а также размер коммунальных платежей.

Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049, а также иными актами законодательства.

Участвовать в аукционе могут юридические и физические лица, включая индивидуальных предпринимателей.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе:**

- уплачивает задаток (юридические лица и индивидуальные предприниматели оплату производят **платежным поручением**!) по соответствующему предмету торгов (назначение платежа – **задаток для участия в аукционе № 157 от 29.08.2014 по предмету аукциона № _____**), перечисляемый на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», код 153001369, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости» (сумма задатка по каждому предмету торгов указана в соответствующей графе таблицы). **Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов;**

- подает организатору аукциона заявление на участие в аукционе с приложением следующих документов (бланк заявления можно получить у организатора аукциона):

***юридическое лицо – резидент Республики Беларусь:***

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***юридическое лицо – нерезидент Республики Беларусь:***

легализованной в установленном порядке копии учредительных документов и выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иного эквивалентного доказательства юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

копии **платежного поручения** либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***индивидуальный предприниматель:***

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***физическое лицо*** – копии платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

- заключает с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), бланк которого можно получить у организатора аукциона.

При подаче заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами и заключении соглашения:

физическое лицо, индивидуальный предприниматель предъявляют организатору аукциона документ, удостоверяющий личность;

представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 30 июля 2014 г. по 25 августа 2014 г. включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К .Маркса, 39, каб. 6.**

Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

**Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.**

**Порядок оформления участия в аукционе:** лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. *При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.*

**Порядок определения победителя аукциона:**

- торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

- аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

**Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 15 000 000 рублей.**

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить **на текущий (расчетный) счет арендодателя** сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. **Информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона**.

***Важно!** Договор аренды по результатам аукциона может быть заключен исключительно с участником аукциона, ставшим победителем (приравненным к нему лицом). Заключение договора аренды помещения, целевое назначение которого предполагает осуществление предпринимательской деятельности, с субъектом, который в силу законодательства не может осуществлять названную деятельность, не допускается.*

**Договора аренды имущества должны быть заключены в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.**

**Телефоны для справок:** отдел аукционов – + 375 (17) 327 40 22, **отдел аренды** – + 375 (17) 327 41 70, 327 47 29, 328 36 57, **бухгалтерия** – + 375 (17) 328 36 58.

**Интернет: www.mgcn.by.**

■ Таленты і прыхільнікі

# КУСТ БЭЗУ, ШАКАЛАДНЫ ГАДЗІННІК І ТЭПЦІК НА ШЧАСЦЕ

## Якія падарункі дораць гледачы любімым артыстам?

Ураджэнца Жодзіна **Яўгена ЛІТВІНКОВІЧА,** які стаў сапраўднай «зоркай» ва Украіне пасля ўдзелу ў тэлепраекце «Х-Фактар 3», паклоннікі вельмі любяць. У знак чаго часта робяць падарункі. Вось і зусім нядаўна больш як 50 удзельнікаў фан-клуба сустрэліся са спеваком і парадавалі таго найсмачнейшымі шашлыкамі ды мноствам незвычайных падарункаў. «Надарылі шмат чаго смачнага, — усміхаецца Яўген, — торты, джэмы, мёд, чай. А яшчэ парадавалі, напрыклад, шакаладным гадзіннікам, вышываным партрэтам, мікрафонам, зробленым з зярнятаў кавы, і цёплай коўдрай, адзін бок якой цалкам зроблены ў выглядзе калажу з маіх фотаздымкаў. І ўсё гэта настолькі шчыра, па-сяброўску, без пафасу — думаю, не перабольшу, калі скажу, што ў мяне самыя цудоўныя прыхільнікі, якія ўмеюць у патрэбны момант падтрымаць і зарадзіць энергіяй на новыя дасягненні! Я пастаянна адчуваю і насамрэч вельмі цаню гэтую падтрымку».



Чым яшчэ ўмеюць здзіўляць паклоннікі, карэспандэнты «Звязды» даведаліся ад папулярных беларускіх артыстаў.

— Апладысменты, выклік на біс, кветкі — вельмі хвалюючы момант, якога чакаеш, але і прэзенты бываюць. Першае, што ўспамінаецца — гэта вялікі фотаздымак матылька ў рамцы. Яго мне падарылі ў Белаазёрску 12 гадоў таму на фестывалі «Белаазёрская восень», — распавядае **спявачка ДАРЫЯ.** — У Добрушы на адным з выступленняў, здаецца, у 2006 годзе, мне падарылі чайны сервіз, якім я карыстаюся да сёння! Застаўся ў памяці і дажджлівы Дзень горада ў Мазыры. Тады, як знарок, не працавала апаратура і не ўдавалася ніяк уключыць мінусоўку. Спявала а капэла, а калі закончыла сваю праграму і пайшла за заслону, да мяне падбеглі дзеці і са словамі: «Ты змагалася, як леў!» — падарылі цацачнага тыгра з пажаданнямі здароўя і далейшых поспехаў. Пасля аднаго з дабрачынных канцэртаў у маім доме «завёўся» дамавік — падарунак ад выхаванцаў інтэрната для дзяцей з асаблівасцямі развіцця.



Памятаеце, як фея-хросная зрабіла са сціплай Папялушкі сапраўдную прынцэсу ў хрустальных туфліках?.. У адданых прыхільнікаў фантазія куды багацейшая. «На адным з канцэртаў прыхільніца падарыла тэпцік, у якім хрысцілі яе дзіця, — узгадвае **Настасся ШПАКОЎСКАЯ, салістка гурта Naka.** Цяпер ён з'яўляецца талісманам гурта. Хоць не заўсёды ўдаецца яго з сабой браць на канцэрты, але гэта самы яркі і запамінальны падарунак. А так, як звычайна, людзі дораць нам нейкія свае кніжкі, хэндмэйд. І такія падарункі заўсёды грэюць душу і запамінаюцца надоўга».



Спеваку **Дзмітрыю КАЛДУНУ** паклоннікі (будзем шчырымі — найперш паклонніцы), акрамя даволі традыцыйных карцін і фотакалажаў, дораць і рознае незвычайнае: аднойчы, напрыклад, гэта была гітара з цукерак, летась — яшчарка (дакладней, самаробнае ўпрыгажэнне-«сузор'е» ў выглядзе яшчаркі, якое спявак паставіў дома). Яшчарак наогул дораць часта — спявак іх калекцыянуе. А яшчэ адзін падарунак Дзмітрый памятае дагэтуль як вельмі своечасовы: «Тады толькі завяршыўся праект «Фабрыка зорак», у якім я ўдзельнічаў, і прыхільнікі, якія з'явіліся ў мяне за гэты час, падарылі машыну для кавы. Паколькі я жыў на здымнай кватэры і харчаваўся як давядзецца, гэты падарунак быў не проста прыемным, але і вельмі карысным».



«Для мяне самымі каштоўнымі і запамінальнымі з'яўляюцца падарункі, зробленыя сваімі рукамі, — дзеліцца **спявачка ГЮНЕШ.** — Магу пахваліцца тым, што мае паклоннікі заўсёды творча падыходзяць да гэтага пытання і не перастаюць радаваць мяне прыемнымі сюрпрызамі. Напрыклад, адна дзяўчына з Магілёва сваімі рукамі робіць сувеніры з маёй выявай — магніты, біжутэрыю. А зусім нядаўна падарыла завушніцы ва ўсходнім стылі. Яшчэ часта дораць карціны, якія самі малююць. Усе работы захоўваюцца дома ў маёй мамы і з'яўляюцца вялікай каштоўнасцю.



На канцэртах самых адданых прыхільнікаў я заўсёды магу пазнаць па букетах белых руж. Яны ведаюць, што я люблю менавіта іх, і заўсёды прыходзяць падрыхтаванымі».

...Мільёны пунсовых ружаў — гучыць, безумоўна, прыемна, але неверагодна. А вось вядомая **тэлевядучая Алена СПІРЫДОВІЧ** без усякіх перабольшанняў можа пахваліцца, што атрымала цэлы куст кветак:



— Памятаю, гэта былі Дні культуры Беларусі ў Латвіі. У Рызе мы ладзілі вялікі канцэрт, недзе ў канцы мая. І вось выходжу я на сцэну, пакуль рыхтуецца чарговы артыст, і нешта расказваю. Заўважаю, што людзі ў зале смяюцца. Павярнулася, а там падкраўся мужчына з абрэзаным кустом бэзу. У мяне хоць любімыя кветкі жоўтага колеру, але таксама вельмі люблю бэз і ландышы. Я на эмоцыях абняла гэты куст і падзякавала. Мужчына пайшоў, а я засталася з бэзам на сцэне. Добра, што «Песняры» дапамаглі мне вынесці яго адтуль. Мы жылі ў маленькай прыватнай гасцініцы і ва ўсе ва́зы, якія былі там, паставілі гэты бэз.

Яшчэ часта дораць жоўтыя рэчы. Сябры, калі бачаць нешта жоўтае і прыгожае, то купляюць для мяне. Даходзіць да смешнага часам. Напрыклад, у Вікторыі Алешкі ёсць куфар для сукенак жоўтага колеру. У мяне ёсць розныя, а такога няма. І Віка, калі сустракаемся з ёй недзе ў грымёрцы, кажа: «Я б табе яго падарыла, але ж там «Алешка» напісана».



**Ніна БАГДАНАВА** адзначае, што найчасцей прыемныя «плюшкі» і ўдзячнасць прыхільнікаў атрымлівала не як спявачка і тэлевядучая, а як любімы дыджэй на радыё:

— Бывала, падчас эфіраў перадавалі нават шашлыкі, торцікі, садавіну, а пасля працы магла знайсці на капоце машыны букеты кветак. Самы цікавы быў выпадак, калі я доўга жартавала: мяса мне дораць, калі ж канапу атрымаю? І вось адзін з актыўных слухачоў, які ўвесь час падпісваўся «медыйны маньяк Ілюша», прапанаваў сустрэчу. Я была дзяўчынай адзінокай і жыла на здымнай кватэры, таму сустрэліся мы ў офісе, каб без рызыкі. Ён паказаў мне матэрыялы і розныя мадэлі канап — маўляў, выбірайце, што падабаецца. Я выбрала вялікую, куткавую канапу з дарагой тканіны. У дзень, калі заказ павінны былі прывезці, раздаўся званок у дзверы. Адчыняю — уваходзяць два грузчыкі і ўносяць частку старой канапы. Я ў слёзы і думаю: «Гэта ж трэба было так паверыць! Хто табе будзе дарыць канапу?» А праз пяць хвілін заходзіць гаспадар той фірмы і іншыя зборшчыкі з маім заказам. Канапа служыць мне вось ужо гадоў пяць. Нават прайшла ўжо выпрабаванне маім сынам, які любіць маляваць на ёй маркерамі. Шкадую, што не працую цяпер на радыё і не магу падзякаваць. Яшчэ адзін з дарагіх для мяне падарункаў быў мне зроблены падчас эфіру 31 снежня. Я дапазна затрымлівалася на працы і адчувала сум і адзіноту. Відаць, недзе ў голасе гэта праскочыла. Кур'ер прывёз мне букет кветак і сертыфікат у ювелірны салон на суму каля ста долараў (у той час — ого!). І потым на яго я набыла завушніцы з белага золата, якія і сёння нашу з задавальненнем.




А вось **беларускі музычны праект «Світар Бойз»** сам любіць рабіць падарункі іншым — то вядомую поп-дзіву Джэніфер Лопез у Мінску здзівяць гармонікам і балалайкай, то праспявае «алілуя» футбольнаму клубу «БАТЭ» або тэнісістцы Вікторыі Азаранцы. Цяпер вось хлопцы зноў запісалі песню да 45-годдзя сваёй любімай спявачкі і адной з самых уплывовых жанчын планеты Джэй Ло — ды не адны, а ў суаўтарстве з папулярным рэперам Mr.President. І без лішніх сумненняў адправілі яе на афіцыйны фан-сайт спявачкі, падпісаўшыся: «from Belarus with neverending Love»! «Мы проста хочам на ўвесь свет голасна абвясціць, што Джэніфер — самая неверагодная, жаданая і любімая жанчына ў свеце», — абвяргаюць падазрэнні ў піяры ўдзельнікі гурта. Поп-зорка беларускім прыхільнікам, дарэчы, падзякавала.

**Алена ДРАПКО, Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота з архіваў артыстаў**

■ І мы там былі

# МСЦІСЛАЎ У ЛАТАХ

## На два дні старадаўні горад Магілёўскай вобласці стаў цэнтрам рыцарскага фэсту

**Звычайны невялічкі райцэнтр было не пазнаць. На яго вуліцах быццам бы перамяшаліся адразу некалькі розных эпох. Жанчыны ў сярэднявечных сукенках, мужчыны ў рыцарскай амуніцыі, дзеці ў традыцыйных строях. Песні, музыка, турніры, конныя баі, кірмаш рамёстваў, гульні, дзіцячыя пляцоўкі прыцягнулі ў Мсціслаў некалькі тысяч чалавек.**



Фота БЕЛТА.

### ПА ГАЛОЎНАЙ ВУЛІЦЫ Ў ЛАТАХ

Цэнтральная плошча горада ледзь умяшчала ўсіх ахвотных паглядзець урачыстае адкрыццё і святочнае шэсце рыцарскіх клубаў. З Беларусі, Расіі, Украіны іх прыехала амаль 320 чалавек.

Асноўным месцам падзей стала Замкавая гара, дзе яшчэ напярэдадні раскінулі свой лагер рыцары і іх дамы. Але фестываль не абмяжоўваўся аднымі замкавымі межамі. У гарадскім скверы працавала выстава-продаж работ дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і гасцінна запрашалі да сябе сельгаспадворкі. Сувеніры на любы густ прапаноўвалі гандляры горада майстроў, палаткі якіх размясціліся аж на чатырох вуліцах Мсціслава. Сярэднявечныя містэрыі дэманстравалі на вуліцы Савецкай батлейкі. Не шкадаваў народ грошай і на платныя забавы. Самымі таннымі з відовішчаў (усяго 5 тысяч рублёў) былі разнастайныя гонкі, дзе ў спрыце спаборнічалі парасяты і нават... пацукі і тараканы. А вось квіткі на рыцарскія турніры, канцэрты фолк-гуртоў і фаер-шоу каштавалі ад 20 да 40 тысяч рублёў.

### ПАД ГУКІ ГАРМАТЫ

Шмат каго цікавілі тыя артэфакты, якія за апошнія два гады былі знойдзены на тэрыторыі Мсціслава і ў яго ваколіцах археолагамі Магілёўскага МДУ імя Куляшова. Летась са дна рэчкі Віхра дайверы мінскага клуба «Марскі Пегас» паднялі астанкі рыцара XVI стагоддзя ва ўнікальных даспехах. Унутры іх былі рэшткі гэтага воіна. На думку гісторыкаў, ён загінуў у 1502 годзе падчас бітвы з маскоўскім войскам. Перапахаванне невядомага рыцара адбылося ля Замкавай гары — за некалькі гадзін да таго, як гаспадар свята князь Расціслаў Мсціславіч разам з княгіняй Анастасіяй Слуцкай аб'явілі аб пачатку фэсту. Як адзначыў кіраўнік археалагічнай экспедыцыі, доктар гістарычных навук, прафесар Ігар Марзалюк, гэта наогул незвычайны для нашай краіны факт: астанкі воінаў часоў ВКЛ дагэтуль яшчэ не знаходзілі. Але, удакладніў ён, не выключана, што падчас далейшых археалагічных даследаванняў з'явяцца і іншыя знаходкі.

### ПА ПАДВАЛАХ КАРМЕЛІЦКАГА КАСЦЁЛА

Кармеліцкі касцёл XVII стагоддзя — адзін з найпрыгажэйшых помнікаў архітэктуры Сярэднявечча. Ён лічыцца гісторыка-культурнай каштоўнасцю 1 катэгорыі, але рэстаўрацыйныя работы тут пакуль не вядуцца. Праўда, на час святочных мерапрыемстваў ён быў усё ж адчынены для турыстаў. Менавіта ў яго сутарэннях Мсціслаўскі гісторыка-археалагічны музей (адзіны па сваім профілі на тэрыторыі вобласці!) на працягу двух дзён дэманстраваў найбольш цікавыя знаходкі (у тым ліку і рэстаўраваныя даспехі таго самага, пахаванага каля Замкавай гары, невядомага рыцара). Тут жа можна было ўбачыць прадметы побыту эпохі Сярэднявечча, а таксама экспазіцыю касцюмаў XII-XVIII стагоддзяў — ад готыкі да Рэнесансу, прадстаўленых дзяржуніверсітэтам імя М. Танка. Яны створаны з сучасных матэрыялаў, але з дакладнасцю перадаюць атмасферу старадаўняй эпохі.

А вось падняцца на самы высокі пункт касцёла, каб з назіральнай пляцоўкі паглядзець на наваколле горада (адтуль усю Замкавую гару з рысталішчам як на далоні відаць), адважыліся нямногія. Вельмі крутымі падаліся ім прыступкі і небяспечнай вышыня. Затое тыя, у якіх атрымалася пераадолець страх і ляноту, не пашкадавалі.

### САМЫЯ АПАНТАНЫЯ РЫЦАРЫ — ТУТ

Па-сапраўднаму святочны дух лунаў над Замкавай гарой, дзе амаль без перапынку адбываліся турніры і канцэрты ў сярэднявечным стылі. Тут жа вучылі асновам старадаўніх танцаў. Ноччу і наогул відовішча было захапляльным. На пляцоўцы, дзе клубы разбілі адзін вялікі лагер, не было свабоднага месца. Тут жа працавалі паходныя кухні, хаця Мсціслаўскае райпа прыгатавала для гасцей смачны боршч, бульбяную кашу і катлеты. Цікава было назіраць за чаргой апранутых па-старадаўняму людзей з міскамі, якіх абслугоўвалі кухары з сучаснага грузавіка.

— Мы тут упершыню, але шмат чаго добрага чулі пра гэты фэст ад нашых калег, арганізацыя — проста супер. Па нас у Смаленск арганізатары нават паслалі аўтобус. І там знайшлося месца і ўсяму нашаму скарбу — сталам, лаўкам, посуду, — дзялілася ўражаннямі Ганна са смаленскага клуба «Крыжак», які 10 гадоў таму заснаваў яе муж. У Мсціслаў сужэнцы прыехалі разам з 6-гадовай дачкой Ірынай.

А вось рыцары смаленскага аддзялення ВГК «Нюрнберг» на фестывалі ўжо другі раз.

— Тут па-сапраўднаму хатняя атмасфера, пазітыўныя людзі, — падзяліўся ўражаннямі Сяргей. Ён якраз рыхтаваў сваю алебарду да бітвы.

— Па правілах бою, мы не прымяняем зброю па яе сапраўдным прызначэнні, але яна павінна захоўвацца ў эстэтычным выглядзе, — патлумачыў ён, перахапіўшы мой погляд. — Але без траўмаў справа не абыходзіцца. Найбольш сур'ёзныя з іх — страсенне мозга ці пераломы. У навічкоў яшчэ бываюць цеплавыя ўдары. Калі на вуліцы такая гарачыня, як цяпер, а ты ў ватоўцы, на якую надзета металічная амуніцыя на 25-30 кілаграмаў, дык не заўсёды бывае камфортна.

На погляд Сяргея, які бываў і на еўрапейскіх турнірах, самыя апантаныя рыцары жывуць у Расіі і Беларусі. «Таму на рыцарскіх турнірах нас амаль ніхто не можа перамагчы апошнія пяць гадоў», — адзначыў ён.

### ГРОШЫ ДЛЯ ХРАМА

Фестываль не толькі дорыць прыемныя хвіліны прыхільнікам сярэднявечнай культуры, ён дае магчымасць развівацца Мсціславу. На тэрыторыі раёна знаходзіцца 72 помнікі архітэктуры, яшчэ 2 — археалагічныя і 1 — помнік гісторыі. На жаль, большасць з іх у занядбаным стане і мае патрэбу ў рэстаўрацыі. Але грошай не хапае. На сярэднявечным свяце фестываль зарабіў амаль 340 мільёнаў рублёў, і гэта без уліку гандлю. Як паведаміла начальнік аддзела ідэалагічнай працы, культуры і па справах моладзі Мсціслаўскага райвыканкама Наталля Біскуп, фестываль цалкам апраўдаў затраты. — Толькі музей сабраў амаль 6 мільёнаў рублёў на выстаўцы ў кармеліцкім касцёле. Улічваючы, што квіток каштаваў усяго 5 тысяч рублёў, вынік вельмі добры, — адзначыла яна. — Мы нават вырашылі пакінуць там гэтую выставу. Не выключна, што частка сродкаў пойдзе на будучую рэстаўрацыю будынка.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

Даты | Падзеі | Людзі

**1029** год — 985 гадоў з часу нараджэння Усяслава Брачыславіча, князя полацкага з 1044 года. Сын Брачыслава Ізяславіча. У 1060-м удзельнічаў разам з братамі Ізяславам, Святаславам і Усеваладам Яраславічамі ў паходзе супраць качэўнікаў-торкаў. Імкнуўся пашырыць Полацкае княства і адстойваў яго самастойнасць. У 1065-м няўдала напаў на Пскоў, аднак здолеў разбіць войска наўгародскага князя Мсціслава на р. Чарэха, пасля чаго ў 1066 годзе захапіў Ноўгарад, вывез з Сафійскага сабора званы і іншыя каштоўныя рэчы, а частку горада спаліў. У бітве на Нямізе ў 1067 годзе быў разбіты Яраславічамі, на перамовах каля Оршы ўзяты імі ў палон і адпраўлены ў Кіеў. Падчас Кіеўскага народнага паўстання 1068-69 гг. вызвалены гараджанамі і 7 месяцаў быў вялікім князем у Кіеве. Падчас паходу на Ізяслава Яраславіча вярнуўся ў Полацк, але быў выгнаны адтуль Ізяславам. З войскам, набраным сярод фінскага племя водзь, у 1069-м разбіты пад Ноўгарадам. У 1071 г. вярнуў княжанне ў Полацку. Пабудаваў Полацкі Сафійскі сабор. За рашучасць, розум і энергію празваны народам Чарадзеем. Памёр у 1101 годзе.



**1828** год — нарадзіўся (вёска Кустовічы былой Гродзенскай губерні) Васіль Паўлавіч Энгельгард, астраном і мецэнат, член-карэспандэнт Пецярбургскай АН (1890), доктар астраноміі. У 1872-79 гадах пабудаваў каля Дрэздэна (Германія) адну з лепшых на той час у Еўропе астранамічных абсерваторый. Праводзіў сістэматычныя астранамічныя назіранні камет, малых планет, туманнасцяў і зорных скопішчаў. Склаў каталог больш як 600 туманнасцяў, даследаваў арбіту і рух малой планеты Дзіяна. Яго працы публікаваліся ў вядучых астранамічных часопісах. У 1886-1895 гадах на ўласныя сродкі выдаў матэрыялы сваіх амаль 20-гадовых астранамічных даследаванняў. У 1897-м перадаў у Казанскі ўніверсітэт інструменты, абсталяванне і навуковую бібліятэку, што дазволіла ў 1899 г. пабудаваць каля Казані новую абсерваторыю, якую пазней назвалі імем навукоўца. Ён быў выдатным музыкам (піяніст, арганіст), прапагандаваў творчасць М. Глінкі, шмат аўтографаў якога і партытуру оперы «Іван Сусанін» перадаў у Публічную бібліятэку Пецярбурга. У канцы XIX ст. захапіўся расійскай ваеннай гісторыяй, прайшоў па месцах, звязаных са швейцарскім паходам Суворава (1799), дзе на ўласныя сродкі ўстанавіў помнікі і мемарыяльныя дошкі. Сабраныя ім матэрыялы (ядры і зброю з месцаў) перадаў у Суvotraўскі музей у Пецярбургу. Памёр у 1915 годзе.

**1933** год — нарадзіўся Артур Вернеравіч Вакер, беларускі вучоны ў галіне анкалогіі, доктар медыцынскіх навук (1995). Аўтар навуковых прац па распрацоўцы методык органазахавальнага лячэння хворых з распаўсюджанымі наватворамі галавы і шыі. Арганізатар лор-анкалагічнай службы ў Беларусі.

Было сказана

**Андрэй ВОЛЯН, палітычны дзеяч, філосаф, ідэолаг Рэфармацыі:**

***«Вартае найчасцей і спараджаецца вартым».***

НАРОДЖАНЫЯ 28 ліпеня

**Гэтыя людзі шукаюць перавагі ва ўсіх сферах жыцця. Навакольныя лічаць іх абыякавымі і нават жорсткімі, калі яны імкнуцца да сваёй мэты, не абарочваюцца і не лічацца ні з якімі выдаткамі. Ім неабходна развіваць у сабе якасці, якія зробяць больш лёгкім кантакт з іншымі людзьмі, — дыпламатычнасць, цярплівасць, павагу да чужых думак, поглядаў. Неабходная ўмова — навучыцца бескарысліва дарыць любоў і прымаць любоў другога чалавека.**

НАРОДЖАНЫЯ 29 ліпеня

**Многія з іх бываюць бліскучымі аналітыкамі, якія вельмі рэдка памыляюцца, робяць папярэднія прагнозы развіцця грамадскіх тэндэнцый. Крытычна ацэньваюць работу іншых, яны не заўважаюць асабістых недахопаў. Яны надзелены моцна развітым пачуццём патрыятызму. У сваім асяродку яны бліскуча выступаюць у ролі арганізатараў і вядучых розных мерапрыемстваў. Многія з іх ганарацца сваімі дзецьмі, сябрамі, сваякамі, высока цэняць значэнне сямейных сувязяў. Яны максімальна клапоцяцца пра блізкіх. Людзі гэтага дня цудоўна спраўляюцца з роляй выкладчыкаў, сацыяльных работнікаў, прафсаюзных і палітычных дзеячаў.**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 5.18 | 21.13 | 15.55 |
| Віцебск | — 5.11 | 21.09 | 15.58 |
| Магілёў | — 5.08 | 21.03 | 15.55 |
| Гомель | — 5.11 | 20.53 | 15.42 |
| Гродна | — 5.34 | 21.27 | 15.53 |
| Брэст | — 5.42 | 21.21 | 15.39 |

**Месяц**

***Маладзік 27 ліпеня. Месяц у сузор'і Льва.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Валянціны, Юліі, Івана, Паўла, Пятра, Фёдара.*
***К.*** *Марты, Антона, Канстанціна.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




**...у суседзяў**

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +27..+29°C | КІЕЎ +29..+31°C | РЫГА +29..+31°C |
| ВІЛЬНЮС +29..+31°C | МАСКВА +29..+31°C | С.-ПЕЦЯРБУРГ +23..+25°C |

## УСМІХНЕМСЯ

**Ахоўнік мэблевага салона ні разу не спаў на адным месцы двойчы.**

Дыялогі ў сеціве.

— Давай сустрэнемся каля «Макдональдса».

— А як я цябе пазнаю?

— Я памахаю табе жыватом.

**Аб'ява ў паліклініцы: «Усіх, хто зразумеў сэнс жыцця, псіхіятр прымае па-за чаргой».**

— Я люблю цябе, мне вельмі добра з табой, давай бачыцца часцей?!

— Не можам мы бачыцца часцей, чым раз на тыдзень — я ж субота!



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.672. Індэкс 63850. Зак. № 3045.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 28 ліпеня 2014 года.